

ПАЧАТАК ВАЙНЫ Ў ЗАРЭЧЧЫ **5**

ФІЛЬМ «КУПАЛА» ЎЗЯЎ УЗНАГАРОДУ **8**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛІСТАПАДА 2020 г. СУБОТА № 228 (29342)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Канстанцін ШЭБЕКА, рэктар Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар эканамічных навук, прафесар:**

*«Калі мы хочам паспяхова завяршыць гэты пераход, трэба на аснове агульнапрынятых інструментаў — стрымлівання і процівагі, балансу інтарэсаў — устанавіць парадак, які задавальняе ўсе сацыяльныя групы ў грамадстве. Толькі такі парадак з'яўляецца ўстойлівым. Трэба проста спыніцца і пачаць размаўляць адно з адным, перастаць падазраваць адно аднаго ў тым, чаго, магчыма, і не было. Тады перспектывы нашай краіны будуць зразумелыя і пралічвацца на доўгатэрміновы перыяд. І тады мы, напэўна, як іншыя паспяховыя еўрапейскія дзяржавы, зможам пабудаваць краіну, якая называецца ўстойлівай дэмакратыяй».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МАЯ ЗАДАЧА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ ПАСЛЯ МЯНЕ ГЭТА НІХТО НЕ РАЗБУРЫЎ»



Фота БелТА.

### Прэзідэнт паабяцаў і надалей падтрымліваць айчыннае машынабудаванне

**«Машынабудаванне — гэта аўтарытэт, твар нацыі». Такая думка прагучала ад Прэзідэнта падчас наведвання ААТ «Гомсельмаш» — аднаго з найбуйнейшых прадпрыемстваў рэгіёна і краіны.**

Захаванне буйнога машынабудаўнічага комплексу — важная задача для нашай прамысловасці, бо гэта галіна дапамагае захаваць традыцыі і кампетэнцыі спецыялістаў. Таму не дзіўна, што на прадпрыемстве працуюць не проста сем'ямі, а дынастыямі. Сярод прычын прыезду Прэзідэнта на Гомельшчыну, як ён сам падзяліўся ў размове з калектывам, — паглядзець, як кіраўніцтва «Гомсельмаша» рэалізавала свае абяцанні, дадзеныя ў дзень прызначэння на пасады. І тут, забягаючы наперад, адзначым — менеджары яго не падвялі. Але гаварылася, як заўсёды бывае падчас падобных паездак, не толькі аб пытаннях прадпрыемства і галіны.

СТАР. 2

# Скандынаўскім крокам



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Слабодка Бешанковіцкага раёна Ніна КУРЫВЕНКА, нягледзячы на ўзрост і клопаты па гаспадарцы і доме, вядзе здаровы лад жыцця, пасябравала са скандынаўскай хадой і кожны вечар абыходзіць вёску. Часта побач з Нінай Паўлаўнай крочыць і яе хатні гадаванец.**

## КОРАТКА

- **У Беларусі прапануецца ўвесці новыя льготы для таленавітай моладзі пры паступленні ў ВНУ.**
- Пагадненне паміж ЕАЭС і Кітаем аб абмене мытнай інфармацыяй уступае ў сілу 21 лістапада.
- **Расійская авіякампанія «Азімут» пачне лётаць з Растова-на-Доне ў Мінск з 17 снежня.**
- Новыя камп'ютарныя тамографы ўстановяць у бальніцах Гродна, Ліды і Навагрудка.
- **Аўтапарк «Беларуснафты» папоўнілі унікальныя 32-тонныя краны МАЗа.**
- Ёлачныя базары ў Гродзенскай вобласці пачнуць работу з 18 снежня.

Ідэі і рашэнні

# Збылася мара, ці Навошта фермеру стары млын?

### Гродзенец наводзіць парадак на зямлі і аднаўляе старажытны будынак

**Гэтыя мясціны Яўген ДАРАГУШ памятае з дзяцінства. Сюды ён часта прыходзіў з гарадскога мікрараёна, каб парыбачыць ці праплыць на аўтамабільнай камеры па рэчках Татарцы і Ласасянцы. Не забыўся пра гэты куток прыроды і тады, калі стаў дарослым. Яму, можна сказаць, пашанцавала. Мясцовыя ўлады выдзелілі фермеру ўчастак зямлі з вадаёмам. А старажытны млын, што стаіць каля возера, гаспадар выкупіў для турыстычных мэт.**

З Яўгенам ад дарогі ідзём праз поле да гэтага самага млына. Па дарозе ён расказвае, што яшчэ са стараданых часоў тут былі адны ўзгоркі. А наогул мясцовасць адметная. Захавалася нават гістарычная дарога, першая згадка пра якую адносіцца да сярэдзіны XVII стагоддзя. Як, дарэчы, і возера з млынам. Яшчэ тут былі карчма і мытня. Дарога, злучала дзве дзяржавы. Там, дзе цяпер фермерская зямля, была тэрыторыя Прусіі, а каля млына — Расійскай імперыі. Менавіта сюды гродзенскі стараста і рэфарматар Антоній Тызенгаўз стаў перавозіць мануфактуры з Гродна. Адна з іх якраз і была размешчана ў млыне.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# «МАЯ ЗАДАЧА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ ПАСЛЯ МЯНЕ ГЭТА НІХТО НЕ РАЗБУРЫЎ»

## «Мы выратавалі прадпрыемствы»

Напачатку Прэзідэнт адзначыў, што яго вельмі хвалявала сітуацыя на прадпрыемстве, таму інфармацыя пра становішча на «Гомсельмашы» ён валодае. Прадукцыя прадаецца, за 10 месяцаў сёлета тэмп росту экспарту ў параўнанні з мінулым годам — 118 %, паступленні срodкаў павялічыліся ў 11,6 раза, за дзевяць месяцаў перавыкананы паказчыкі бізнес-плана. Пералічыў **гендырэктар Аляксандр НОВІКАЎ** асноўныя эканамічныя даныя ААТ. Тэмпы росту холдынга — 115 %, рэнтабельнасць продажаў — 6,3 %, сярэдні заробак — 1074 рублі. У планах да канца года — стварыць больш за 1800 адзінак тэхнікі і рэалізаваць 2250.

Прэзідэнт высока ацаніў поспехі прадпрыемства і яго кіраўнікоў: «Ведаеце, некаторыя нам прапануюць перамены і рэформы: «А, гэта не трэба, прададзім». Але мы пайшлі іншым шляхам, магчыма, крыху нестандартным, сацыялістычным шляхам. Не важна якім, але мы выратавалі прадпрыемствы. Так, дзесьці яны напружыліся, але і дзяржава плячо падставіла», — сказаў кіраўнік краіны і заявіў, што і далей будуць падтрымліваць і вытворчасць, і працоўных — на холдынгу іх амаль 13 тысяч чалавек, якія кормяць свае сем'і. Закрануў Прэзідэнт і тэму скарачэння работнікаў. «Людзі выходзяць на пенсію, хтосьці сам звальняецца, сыходзіць на іншыя прадпрыемствы. Трэба натуральным шляхам скарачацца. Нельга выкідваць людзей на вуліцу, якія б яны ні былі. Так, хтосьці па-іншаму думае, хтосьці запратэставаў і іншае. Праз год усё зразумеюць, глядзі: прайшло два-тры месяцы — ужо многія заводы зразумелі. На «Гомсельмашы» чаму ёсць вынік? Таму што тут пратэстуноў не было, як бы іх не спрабавалі разгайдаць», — канстатаваў Прэзідэнт.

Генеральны канструктар Навукова-тэхнічнага цэнтра камбайнабудавання «Гомсельмаша» Сяргей Федаравіч расказаў пра навінкі прадпрыемства і іх вытворчыя магчымасці. Па словах спецыяліста, самая сур'ёзная барацьба сёння ідзе за «электронку» — аблягчэнне працы механізатараў, навучанне іх тэхналогіям дакладнага земляробства, спутнікавым сістэмам.

«Адзін з сур'ёзных кірункаў — гэта выкарыстанне штучнага інтэлекту для кіравання машынай», — паведаміў Сяргей Федаравіч. Такі камбайн без механізатара ўжо выпрабавалі сёлета ў Гомельскай вобласці.

Прэзідэнт адзначыў, што важныя не толькі магутнасць тэхнікі, але і падрыхтоўка палёў да апрацоўкі. «Вы маленькі крок зрабілі (у сферы сельскай гаспадаркі. — «**Зв.**»), але Гомельшчына павінна падцягвацца хоць бы да ўзроўню Брэсцкай вобласці», — паставіў ён задачу прысутным.

## Камбайн да Афрыкі давядзе

Пасля знаёмства з «абноўкамі» машыннага парка «Гомсельмаша» і цэхамі прадпрыемства Прэзідэнт, як звычайна, сустрэўся з працоўным калектывам — адказаў на некалькі пытанняў супрацоўнікаў і журналістаў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, на Гомельшчыне шмат людзей, якія з году ў год падтрымлівалі дзяржаву, уладу і асабіста Прэзідэнта.

«Не скажу, што з-за гэтага мы падтрымліваем ваша прадпрыемства. Проста ад вас няма куды дзецца, як без камбайнаў? Вы ствараеце той тавар і прадукт, якія неабходныя краіне. І не толькі нашай краіне — амаль 75 працэнтаў у вас экспарту», — сказаў Прэзідэнт.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: дзяржава ва ўсе часы аказвала значную падтрымку кампаніі яшчэ і таму, што на «Гомсельмаш» «павесілі» «Лідаграпраммаш» і «Гомельскі завод ліцця і нармаляў». Усе прадпрыемствы холдынга сёння працуюць з прыбыткам.

Яго асабліва радуе, што «Гомсельмаш» змог поўнасцю разгрузіць свае склады і прадукцыя сёння прадаецца «з калёс». Адзначыў Прэзідэнт пастаўкі ў Афрыканскі рэгіён, неабходна асвойваць гэты рынак і далей, бо ён развіваецца.

Ён назваў канструктарскія распрацоўкі «Гомсельмаша» сплавам маладосці і вопыту, адзначыўшы, што на ўсіх прадпрыемствах неабходна даваць магчымасці рэалізавацца новым кадрам. Каб не страціць кампетэнцыі, прапанаваў падумаць над накіраваннем у будучым годзе ў мінскія ВНУ мэтавых спецыялістаў, якія будуць пасля працаваць на малой радзіме.

Таксама, па яго словах, кожны працоўны павінен рупіцца аб якасці тавараў — гэта залог экспарту, а канкурэнцыя ў сферы вытворчасці сельгастэхнікі ў свеце вялікая. «Ад гэтага нікуды не дзенешся, калі мы хочам застацца з машынабудаўнічай прадукцыяй. ***А што такое машынабудаванне? Гэта мазгі людзей. Не будзе яго — студэнтаў не будзе. Тэхнароў не будзе. Мы страцім кампетэнцыі, як гэта ў нас па пэўных кірунках адбылося пасля распаду Савецкага Саюза. Машынабудаванне неабходна трымаць, трэба чапляцца за машынабудаванне, таму што гэта аўтарытэт, твар нацыі»,*** — падкрэсліў Прэзідэнт.

На яго думку, у нашых машынабудаўнікоў шмат патэнцыйных рынкаў, нават на постсавецкай прасторы — Казахстан, Украіна, Каўказскі рэгіён.

Па выніках дакладаў і знаёмства з прадпрыемствам Прэзідэнт рэзюмаваў — холдынг і «Бабруйскшына» (пастаўляе сваю прадукцыю на «Гомсельмаш») яго парадавалі. ***«Такія буйныя ў нас 4—5 кампаній, калі ажывуць і будуць рухацца наперад, аснову гэтай дзяржавы, эканоміку, мы захаваем».***

## «Галоўнае — у нас будуць інжынеры»

Адно з пытанняў кіраўніку дзяржавы — пра перспектыву машынабудаўнічай галіны нашай краіны.

«Гэта аснова. Для мяне, як Прэзідэнта, гэта аснова — захаваць машынабудаванне. Для чаго? Не для таго, каб выраблядь гэтыя жалязякі, не ў гэтым галоўнае, — адказаў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае — у нас будуць інжынеры. У нас будуць канструктары, кіраўнікі».

Ён лічыць невыпадковым, што інжынерна-тэхнічныя работнікі амаль не ўдзельнічаюць у акцыях пратэсту. ***«Інжынеры — зусім іншыя людзі. І калі я прызначаю на пасаду людзей, гляджу біяграфію чалавека, калі ў яго ёсць армія і рабочая закваска, ды яшчэ калі ён інжынерам недзе папрацаваў — зялёная вуліца,*** — расказаў беларускі лідар. — Вось галоўнае — мы мазгі захоўваем, людзей. Таму гэта вельмі важна».

Яшчэ адна прычына развіваць гэтую галіну — дасягнутае за апошнія 25 гадоў.

Аляксандр Лукашэнка ўспомніў часы, калі ў Беларусі не было тэхнікі, каб убраць хлеб. Гэта, па яго словах, было ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Камбайны, набытыя падчас існавання СССР, ужо зносіліся, і, каб выратаваць сітуацыю, прыходзілася прыдумляць і выкручвацца з тым, што было.

«І вось тады было галоўнае пытанне — што рабіць з «Гомсельмашам», — успомніў Аляксандр Лукашэнка. — Ці будзем мы вырабляць свае кормаўборачныя і збожжаўборачныя камбайны? А тады ж толькі два тыпы выраблялі».

У той час гучалі аргументы супраць будаўніцтва свайго камбайна, прапаноўвалася закупляць гэтую тэхніку, напрыклад, у Германіі.

«Я гавару: а за што купім? Для таго каб купіць дарагія камбайны ў Германіі маркі CLAAS ці John Deere — амерыканскія камбайны, вялізныя грошы патрэбныя. І тады мы прынялі рашэнне: будзем рабіць свой камбайн», — расказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на пройдзены шлях: ***«Калі вы мяне пытаецеся, якая перспектыва — ды я ніколі ў жыцці не загублю тое, што рабіў, у тым ліку і ўласнымі рукамі.*** Таму машынабудаванню ў Беларусі быць».

Зробленае не зможа знішчыць і іншая ўлада, упэўнены беларускі лідар. ***«Мая задача зрабіць так, каб пасля мяне гэта ніхто не разбурыў,*** — падкрэсліў ён. — Не змог. Бо вы выйдзеце тады на вуліцы і будзеце пратэставаць. ***Таму ніякай здрады, гэтага вы нават не кажыце пра мяне — вы дакладна ведаеце, што я нікому не здраджваў і не здраджу, нават калі майму жыццю будзе пагроза. Гэта выключана».***

## Пры гэтым Прэзідэнт не супраць сумеснай вытворчасці

«Укладвайце грошы, мы не супраць. Я пра Казахстан сказаў (магчымасць уваходжання казахстанскага капіталу ў «Гомсельмаш» абмяркоўвалася ў тым ліку падчас леташняга візіту беларускага лідара ў Нур-Султан. — «**Зв.**»). Але ўкладайце так, каб мы карысць ад гэтага атрымалі, а для нас галоўнае зараз — рынкі, — растлумачыў ён. — Калі будзе куды прадаць, дзе збожжа вырошчваецца і кармы, — калі ласка, мы адкрытыя, прыходзьце. Але на тых умовах, якія стаўлю, не надта хочуць».

Умовы, якія ставіць Прэзідэнт, датычацца і захавання працоўнага калектыву. Пазіцыя кіраўніка дзяржавы — нельга ў адзін момант выставіць на вуліцу некалькі тысяч чалавек. «Больш за тое, сёння дырэктар кажа, што тут патрэба ў 200—300 чалавеках. Але таленавітых, здольных спецыялістаў, каб былі зваршчыкі, шліфоўшчыкі і іншыя. Гэтыя прафесіі запатрабаваныя. Таму ***няхай моладзь думае, што рабочы — гэта ўжо не раб, не, сёння рабочы чалавек — гэта залатыя рукі. І вялізны попыт на рабочых»,*** — зазначыў ён.

Праблема дэфіцыту кваліфікаваных рабочых неяк закранался і на саміце ЕАЭС, расказаў Аляксандр Лукашэнка. У Кыргызстане і Расіі страцілі сістэму прафтэхадукацыі, але ў Беларусі яна захавалася, і наша краіна аказвае, па яго словах, дапамогу ў падрыхтоўцы рабочых кадраў для іншых краін.

Некалькі слоў Прэзідэнт сказаў і пра студэнтаў ВНУ: «Мы сёння навучаем студэнтаў больш, чым у Савецкім Саюзе. Нам столькі не трэба, гадоў 12 таму паўстала пытанне: што рабіць? Давайце будзем навучаць столькі, колькі патрэбна Беларусі. Разумна было пастаўленае пытанне». Тым не менш ён тады выступіў супраць скарачэння набору ў ВНУ і сказаў, што не шкадуе аб прынятым рашэнні наконт захавання набораў у ВНУ: ***«Няхай у нас будуць адукаваныя людзі. Толькі галаву трэба трымаць на плячах».***

Ён пахваліў завадчан за працоўныя дынастыі і заклікаў іх захоўваць вытворчасць.

## «Я не хачу, каб мы сталі прыдаткам»

Прыватызацыя такіх прадпрыемстваў, як «Гомсельмаш», не заўсёды абарочваецца дабром для тых, хто там працуе, дадаў беларускі лідар.

Акрамя скарачэння калектыву, жадання патэнцыйнага пакупніка набыць за бясцэнак, ёсць рызыка згортвання кампетэнцый.

Аляксандр Лукашэнка сказаў: ён ведае што гэта такое — калі народ ствараў каштоўнасці, якія могуць быць прададзеныя за бесцань.

***«Таму вы нават не думайце, што я пайду на абвальную нейкую прыватызацыю. Плаціце грошы, а мы потым будзем глядзець, што мы ад гэтай прыватызацыі атрымаем.*** Калі дасце грошы, мы створым новую тэхніку і на ваш рынак, як у Казахстане, паставім», — рэзюмаваў ён і дадаў, што не пагадзіўся наваt на прыватызацыю з боку расіян, бо не пажадаў, каб «Гомсельмаш» стаў прыдаткам «Растсельмаша».

Падобны матыў адмовы ў прыватызацыі МАЗа, МЗКЦ, іншых вытворчасцяў.

***«Я не хачу, каб мы сталі прыдаткам кагосьці, вось і ўся палітыка,*** — падсумаваў беларускі лідар. — Таму ***не перажывайце. Усё міне. Было і больш складана».***

## Як лепш для людзей і дзяржавы?

Пры адказе на пытанне супрацоўніцы завода — маці траіх дзяцей, Прэзідэнт падкрэсліў, што перад уладамі стаіць задача ў комплексе разгледзець «шматдзетнасць». Асноўная мэта, каб грашовая дапамога, якую выплачваюць да трох гадоў малым, даходзіла на іх патрэбы. Ёсць планы перагледзець і тэрмін знаходжання ў водпуску па выхаванні дзіцяці.

«Некаторыя сядзяць у дэкрэтным водпуску два гады, а з двух гадоў дзіця адводзяць у яслі. То-бок, дзіця маці аддала дзяржаве, мы яго глядзім, а яна сядзіць у дэкрэтным. Гэта не значыць, што ўсё і скарацідэкрэтны водпуск. Але мала краін засталося з трыма гадамі дэкрэтнага водпуску. І самі жанчыны ўнеслі прапанову скарацідь тэрмін да двух гадоў», — заявіў кіраўнік краіны.

Па яго словах, усе гэтыя пытанні па тэме ён сабраў і накіраваў ва ўрад і дэпутатам. «Абмяркоўвайце, райцеся са сваімі выбаршчыкамі, а потым унясіце Прэзідэнту, будзем прымаць рашэнне. То-бок, мы не прынялі ні па адным з пытанняў рашэння, але гэтыя пытанні на парадку дня. Зробім як лепш для людзей і дзяржавы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што толькі калі ў кожнай сям'і з'явіцца па тры дзіцяці, у краіне будзе прырост насельніцтва.

Кіраўнік краіны нагадаў пра магчымасці атрымаць амаль 10 тысяч долараў «сямейнага капіталу» на трэцяе дзіця. Патрацідь гэтыя грошы спачатку магчыма было з 18-гадовага ўзросту дзіцяці, з цягам часу дазволілі раней скарыстацца сродкамі для лячэння, адукацыі і набыцця жылля шматдзетнымі.

***«Нараджайце, будзем знаходзіць гэтыя грошы па 10 тысяч долараў на кожнае дзіця пасля дваіх. Гэта галоўнае. Не будзе дзяцей — не будзе працоўных, і ніякія адукацыі і кампетэнцыі не трэба»,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## «Падвяргай усё сумненню»

Журналісты таксама задалі некалькі пытанняў Прэзідэнту. Адно з іх было пра непацверджаную інфармацыю са згадваннем вядомых у Беларусі прозвішчаў, якая з'яўляецца ў ананімных тэлеграм-каналах.

Калі размова пра так званыя злівы тэлефонных перагавораў, якія датычацца гібелі Рамана Бандарэнкі, то поўны адказ будзе дадзены на будучым тыдні, паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

«Але ўсім вам павінен сказаць: ад інтэрнэту нікуды не падзецца. Папершае. А па-другое, гэта сметніца, але ж шмат карыснага. Аператыўнасць», — адзначыў ён і паведаміў, што сам не карыстаецца мабільнай сувяззю, бо мабільныя тэлефоны дазваляюць адсочваць месцазнаходжанне людзей і падслухоўваць іх размовы.

«Таму больш акуратна з гэтымі тэлефонамі, — параіў Аляксандр Лукашэнка. — Калі вы нешта бачыце, вось, як ты сказаў, апошнія гэтыя злівы: размовы там, прозвішчы, правільна ты заўважыў... Ужо пералічваюць прозвішчы бліжэй да Прэзідэнта. Чаму гэта робяць зараз? А нядзеля! (па нядзелях тры месяцы запар у Мінску адбываюцца пратэсныя шэсці. — «**Зв.**»)».

Ён упэўнены, што пахаванне Рамана Бандарэнкі, які загінуў пасля бойкі з-за бел-чырвона-белай сімволікі ў сваім двары, апаненты ўлады хацелі выкарыстаць, каб мабілізаваць людзей на выказванне пратэсту, але сям'я хлопца не пажадала гэтага. Таму і адбылося ўкіданне новай інфармацыі, сцвярджае беларускі лідар.

***«Падвяргай усё сумненню,*** — нагадаў класіка Аляксандр Лукашэнка. — ***Што б ты ні рабіў у жыцці, нават калі гэта абсалютна відавочна, падвергні гэта сумненню, правер яшчэ раз, прарэвізуй дзясяткі разоў — не будзеш памыляцца. Падвяргайце ўсё сумненню. Не спяшайцеся ніколі. І ведайце, што нас зараз раздзіраюць.*** Пачалі з бліцкрыгу, кветачкі і іншае, радыкалізацыя, страйкі — не пайшлі рабочыя. А што рабіць? Як падтрымаць пратэсны настрой? Як далей рухацца?»

Згуртаванні людзей, якія пражываюць на адной дваровай тэрыторыі, на думку Прэзідэнта, таксама маюць небяспеку. «Для некага гэта дваровыя тэрыторыі, жартачкі, а для нас вясной — гэта ачаг грамадзянскай вайны, — папярэдзіў ён. — Што будзем рабіць потым? І яны не дурныя. Гэта не нашы гэтыя вось тэлеграмканальшчыкі, яны ж сапліве ўсе, ім па 23-25 гадоў самае вялікае. Гэта не яны. Супраць нас працуе магутная спецслужба свету — ЗША. Яны пад Варшавай цэнтр стварылі, а зараз у Кіеве стварылі. Добра, я б сказаў. Але мы з расіянамі, разведка наша і расійская, папрацавалі і ўбачылі гэтыя цэнтры. Ніводнага паляка там няма. Гэта толькі тэрыторыя. Там усе амерыканцы сядзяць. Разумныя, таленавітыя, здольныя людзі».

Беларусь стала некаму ўпоперак горла, бо аказалася занадта самастойнай і трывалай, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

## Тлумачыць людзям сэнс і гісторыю

У адказ на адно з пытанняў журналіста аб палітычных падзеях, кіраўнік краіны заявіў, што прыбяраць бел-чырвона-белыя сцягі як фашысцкую сімволіку з нашага грамадства і зробіць гэта прыгожа, тлумачачы людзям сэнс і гісторыю гэтага сімвала. Прэзідэнт канстатаваў, што бела-чырвона-белы сцяг лічыць фашысцкай сімволікай і сам унёс у 90-х пытанне аб змене дзяржаўнай сімволікі на рэферэндуме.

***«Пераважная большасць падтрымала сённяшнюю дзяржаўную сімволіку, якія да мяне пытанні?*** Прытым Лукашэнкі партрэтаў пад бчб-сцягамі не было, а фашыстаў і Гітлера былі, і мы паказваем гэта. Хто мог падумаць, што тэатр Янкі Купалы, які быў у гады вайны ўвешаны бчб-сцягамі, будзе пад гэтымі сцягамі ў гэтым годзе?», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, фашызм як крайняя форма нацыяналізму непрымальная для яго як чалавека з талерантнымі поглядамі.

***«Што датычыцца фашызму, ты да мяне ніяк не прыклеіш, бо я інтэрнацыяналны чалавек.*** Для мяне, што ўкраінец, што рускі, што паляк, што беларус, літовец, немец — усё роўна. Вы ж бачыце маю палітыку, ***я заўсёды ганарыўся, што ў нас няма боек і супярэчнасцяў паміж рознымі нацыянальнасцямі»,*** — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
*г. Гомель.*

Наш фармат

# Канструктыўны дыялог

## як «маркер» здароўя грамадства

**Жыхары Гомельшчыны актыўна ўключыліся ў новы фармат абмеркавання грамадска-палітычнага жыцця ў краіне. Свае прапановы яны агучваюць у грамадскіх прыёмных, якія штотыдзень арганізуюць пры Гомельскім абласным выканаўчым камітэце. Чарговы прыём правёў старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Пётр ШУЦЬКО.**



У сваіх прапановах жыхары рэгіёна гэтым разам закранalі тэму рэфармавання выбарчай сістэмы ўлады. Так, пенсіянер з аграгарадка Крупец, што ў Добрушскім раёне, Віктар Шавель выступіў з прапановай, каб у парламент абіраліся дэпутаты не па партыйных спісах, а праз працоўныя калектывы:

— Няхай іх вылучаюць тыя людзі, якія працуюць побач з імі. Тады будуць ацэньваць народных абраннікаў не толькі па іх палітычных праграмах, але і па іх працы. Нельга схлусіць тым, з кім побач працуеш, — выказаў сваё меркаванне пенсіянер. — Плюс трэба павышаць ролю працоўных калектываў у кіраванні прадпрыемствамі, на якіх яны працуюць. Неабходны не толькі дзяржаўны, але і народны кантроль.

Сваю прапанову падчас работы грамадскай прыёмнай агучыў пенсіянер, інвалід I групы Юрый Казіятка. На яго думку, трэба мадэрнізаваць сістэму кіравання, але «не ламаць»:

— Заслуга Прэзідэнта Лукашэнкі ў тым, што, атрымаўшы Беларусь пасля развалу Саюза, ён паклапаціўся аб адраджэнні сельскай гаспадаркі, стварэнні нацыянальнай арміі, аб падтрымцы і мадэрнізацыі прамысловасці. Пакуль ад моцнай улады — адны плюсы. Навошта ўсё ламаць? — упэўнены гамяльчанін.

Мужчына закрануў тэму крэдытавання людзей яго ўзроставай катэгорыі пры афармленні растэрміноўкі ў гандлёвых сетках:

— Прашу заканадаўча зацацаваць права набываць пральныя машыны, халадзільнікі, тэлевізары новага ўзору, не абмяжоўваючы ўзроставыя рамкі чалавека 68 гадамі, — падзяліўся сваім меркаваннем пенсіянер.

На тое, што работа ў фармаце грамадскіх прыёмных у многім — працяг дыялогавых пляцовак і практыкі прамых ліній, звярнуў увагу пасля звароту грамадзян Пётр Шуцько:

— Такі фармат дыялогу традыцыйна існуе ў выканкамах. Ад чалавека можна пачуць аб праблеме, якая для яго важная. Калі не атрымліваецца аператыўна вырашыць пытанне, то можна з дапамогай унясення змяненняў у заканадаўства ўсё ж дамагчыся важнага для людзей выніку. Таму мы сёння прымаем да вывучэння розныя прапановы, абмяркоўваем іх, дапрацоўваем, каб вынесці затым на грамадскае абмеркаванне.

Акрамя таго, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама зазначыў, што дыялог вядзецца актыўна і канструктыўна:

— Важна, як адзначыў нядаўна кіраўнік дзяржавы, не ламаць існуючую Канстытуцыю, а вырашаць усе пытанні, як у цывілізаваным грамадстве. Беларусы гэта разумеюць, — падкрэсліў Пётр Шуцько.

Нагадаем, што грамадскія прыёмныя працуюць па ўсёй краіне. Напрыклад, у Гомелі прапановы можна пакінуць у аўторак і чацвер з 16.00 да 18.00 па адрасе: пр-т Леніна, 2, кабінет 106. Звярнуцца можна як асабіста, так і па тэлефоне 8 (0232) 33-12-37.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

На слыху

# АСАБЛІВА ЎРАЗЛІВЫЯ КАТЭГОРЫІ

## будуць вакцынавацца ад COVID-19 у першую чаргу

**А гэта каля двух мільёнаў чалавек — менавіта такую лічбу агучыў выконваючы абавязкі міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ, адказваючы на пытанне аднаго з сенатараў падчас абмеркавання змяненняў законаў аб ахове здароўя і аказанні псіхалагічнай дапамогі, якія ўчора разглядалі ў Савеце Рэспублікі.**

Па яго словах, плануецца вакцынаванне за сродкі бюджэту каля двух мільёнаў чалавек з катэгорыі найбольш уразлівых: маецца на ўвазе прадстаўнікоў тых прафесій, якія найбольш кантактуюць з людзьмі, — медыцынскія, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі сферы гандлю ды іншыя.

— Мы будзем прышчапляць, пачынаючы з невялікіх груп насельніцтва, але плануем паялічыць гэты ахоп да двух мільёнаў чалавек, — удакладніў у размове з журналістамі Дзмітрый Піневіч.

Ён нагадаў, што зараз праводзяцца клінічныя даследаванні трэцяй фазы вакцыны ад COVID-19 расійскай вытворчасці. Кіраўнік ведамства растлумачыў, што далейшыя крокі па супрацьдзеянні распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі з дапамогай вакцыны можна будзе вызначыць пасля дэталізацыі «дарожнай карты», якая павінна з'явіцца ў хуткім часе.

У межах дамоўленасцяў, дасягнутых паміж кіраўнікамі Расіі і Беларусі, зараз вырашаецца пытанне аб вытворчасці згаданай вакцыны на тэрыторыі нашай краіны, удакладніў суразмоўнік.

— Праз два тыдні будзем ведаць тэрміны, аб'ёмы і месца выпуску, — растлумачыў ён.

Дзмітрый Піневіч таксама нагадаў, што вакцынаванне з'яўляецца адным з дзейсных спосабаў уплыву на эпідэміялагічныя працэсы.

— Памятаеце, калі ў 2009 годзе была эпідэмія свінога грыпу, на той момант прышчэпкі рабілі, калі не памыляюся, 7-8 % насельніцтва. Пасля той эпідэміі вакцынуецца каля 40 % насельніцтва штогод, і сёлета ахвотных было яшчэ больш, — рэзюмаваў ён.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ. НОВЫЯ МЕСЦЫ

### На прадпрыемстве «Брэстгазаапарат» запрацаваў новы вытворчы корпус

**У мікрараёне Бярозаўка абласнога цэнтра пачаў дзейнічаць новы корпус па арганізацыі ўласнай вытворчасці гарэлак стала. Пра гэта ў сваім тэлеграм-канале паведаміў старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Запуск названай вытворчасці дазваляе аптымізаваць тэхналагічныя працэсы, лакалізаваць нарыхтоўчую дзейнасць і, галоўнае, стварыць у перспектыве больш за 70 новых рабочых месцаў.



Аб'ект разлічаны на выпуск 500 тысяч камплектаў гарэлачных груп. Узвядзенне корпуса стала вынікам рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Будаўніцтва ліцця СП ААТ «Брэстгазаапарат».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Аляксандра Рагачука.**

## РУХ АДНОЎЛЕНЫ

### Мост цераз Котру ўвялі ў эксплуатацыю

Цяпер не трэба накручваць лішнія кіламетры на трасе М6, а можна ехаць па кароткім маршруце. Раней з-за вялікага патоку аўтамабільнага транспарту тут часта ўзнікалі заторы. Два аўтамабілі нават не маглі размінуцца. Пасля рэканструкцыі мост значна пашырыўся.



Мост цераз раку Котру каля Скідзеля пабудаваны яшчэ ў 50-я гады мінулага стагоддзя з канструкцый разабранага моста ваеннага прызначэння. Цяпер ад былой пабудовы засталіся толькі прамежкавыя апоры. Старыя бэлькі замянілі і паклалі новую маналітную пліту. Мост значна пашырыўся, цяпер ён двухпалосны, з'явіліся два тратуары для пешаходаў, узмоцнены берагавыя адкосы, устаноўлены новыя бар'ерныя агароджы. Работы вяліся філіялам «Аўтамост» прадпрыемства «Гроднаблдарбуд». Мост цалкам адноўлены за восем месяцаў.

Адкрыццё гэтага аб'екта спрасціла рух па трасе М6 і выезд з горада-спадарожніка Скідзеля ў Гродна.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота grodnonews.**

## З ПАВАГАЙ ДА ПОДЗВІГУ

### Блізу Віцебска перапахавалі больш за сорак чырвонаармейцаў

**У наваколлях вёскі Навікі Віцебскага раёна, што прыкладна за 20 кіламетраў ад Віцебска, на воінскім мемарыяле ва ўрачыстай абстаноўцы былі перапахаваны 42 вызваліцелі Прыдзвіння.**

Яны загінулі зімой—вясной 1944 года. Іх астанкі знайшлі гэтым летам, дзякуючы пошукавікам з Наваполацка, Маскоўскай вобласці і ваеннаслужачым 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, растлумачылі ў райвыканкаме.

Ад імя выканаўчай улады Прыдзвіння ім падзякаваў начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Генадзь Ягораў. Ён падкрэсліў, што інтарэс і павага да подзвігу бацькоў і дзядоў — добры прыклад патрыятызму і выхавання любові да Радзімы ў моладзі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НАЙЛЕПШАМУ САЛДАТУ І ЯГО БАЦЬКАМ

**У Дзівіне Кобрынскага раёна адзначылі найлепшага ваеннаслужачага тэрміновай ваеннай службы 111-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады і выказалі падзяку яго бацькам. Мерапрыемства адбылося ў музейным пакоі Дзівінскай сярэдняй школы. Гадзіннік ад міністра абароны Андрэю Ванью ўручыў ваенны камісар Кобрынскага і Жабінкаўскага раёнаў Аляксандр САМАРЭВІЧ. А бацькі дэмабілізаванага салдата Алена Іванаўна і Уладзімір Аляксандравіч атрымалі падзячныя лісты.**

Як расказаў афіцыйны прадстаўнік названай артылерыйскай брыгады Мікіта МАЛОДЧАНКА, за час службы Андрэй Ванью паказаў сябе найлепшым чынам. Ён добра асвоіў спецыяльнасць механіка-вадзіцеля самаходнай артылерыйскай устаноўкі. Службу прайшоў на выдатна.



Падчас уручэння ўзнагароды.

Да арміі Андрэй скончыў Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, атрымаў спецыяльнасць эканаміста. Пасля вучобы стаў працаваць у прадстаўніцтве Дзяржстраха па горадзе Брэсце. Але восенню хлопец атрымаў павестку і пайшоў у войска. Сумленна адслужыў год і збіраецца вярнуцца на ранейшую работу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# У АДПАВЕДНАСЦІ СА СТАНАМ ЗДАРОЎЯ

## Перахварэлым на COVID-19 для рэабілітацыі прапануюць шпіталь для ветэранаў ВАВ

**У Віцебску для інфіцыраваных каранавірусам пацыентаў вылучаюцца нават асобныя медыцынскія ўстановы.**

Напрыклад, паводле інфармацыі абласнога штаба па супрацьдзеянні распаўсюджванню COVID-19, у Віцебскім абласным клінічным радзільным доме аказваюць спецыялізаваную дапамогу інфіцыраваным цяжарным жанчынам і жанчынам з гінекалагічнымі праблемамі. А жанчын без «ковіду» перавялі ў гарадскі клінічны радзільны дом № 2. Іншых інфіцыраваных пацыентаў шпіталізуюць у хірургічным корпусе Віцебскага абласнога клінічнага анкалагічнага дыспансера.

Ёсць і іншыя прыклады пераводу пацыентаў у адпаведнасці з іх станам здароўя.

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ**, у райцэнтрах медыкі спраўляюцца з павелічэннем колькасці «ковідных» пацыентаў, і калі трэба, у Віцебску гатовыя прыняць цяжкахворых.

Што датычыцца рэабілітацыі, яна праводзіцца ў вельмі добрых умовах. У прыватнасці, да паслуг пацыентаў Віцебскі абласны шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны «Юрцава», які знаходзіцца ў аднайменнай вёсцы, што ў Аршанскім раёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Збылася мара...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Па прафесіі Яўген Дарагуш — праграміст, але вельмі цікавіцца гісторыяй. Перачытаў нямала артыкулаў пра гэтыя мясціны, пазнаёміўся з архіўнымі матэрыяламі. Такім чынам даведаўся, што тут знаходзілася да трох дзясяткаў млыноў на штучных вадаёмах і найбліжэйшых рэчках — Татарцы і Ласасянцы. А яшчэ Яўген расказаў, што ў гэтых мясцінах павінен быў прайсці знакаміты Аўгустоўскі канал. Месца было перавалачнае і для воднай транспарціроўкі грузаў. Але канал усё ж такі пабудавалі крыху далей, бо не змаглі дамовіцца з уласнікамі зямлі.

— Я бачыў, як гэтае месца паступова ператвараецца ў сметнік. Калі з'явілася магчымасць, я з таварышам выкупіў млын і стаў займацца фермерскай гаспадаркай. У планах было аднавіць вадаём і займацца аграэкатурызмам, фермерствам, — растлумачыў суразмоўнік.

Прайшоўшы праз поле, падыходзім да старажытнага млына. З-за шума вады здаецца, што ён у рабочым стане. Яго прызначэнне відавочнае яшчэ і таму, што захаваліся многія старыя механізмы. У прыватнасці, кола, якое калісьці прыводзіла ў рух вада. Гродзенец мяркуе, што спачатку тут быў драўляны млын, і толькі ў часы Тызенгаўза пабудавалі каменны. На будынку бачны пласты некалькіх эпох. Напрыклад, арка і частка сцяны захаваліся з XVIII стагоддзя. Ёсць кладка савецкага часу, аб чым сведчыць адпаведны раствор. А ёсць і больш сучасны рамонт.

Абыходзім будынак з іншага боку. На тарцы добра відаць лічбы — 1894. Па словах Яўгена, гэта дата апошняй рэканструкцыі млына. Такім ён дайшоў да нашых часоў.

— Апошняй рэканструкцыяй займалася яўрэйская сям'я, якая зладзіла тут вытворчасць панчох. Але падрабязных звестак аб гэтым я амаль не знайшоў, хоць прагледзеў архіўныя дакументы, магчыма яны ёсць у Вільнюсе, — расказвае



Яўген. — Гаспадар з сям'ёй жыў тут да 1938 года, а потым вытворчасць і свой дом прадаў паляку і з'ехаў у ЗША. Млын працаваў да пачатку 50-х гадоў. Пры ім была лесапілка, дзе выраблялі гонту. Але неўзабаве ўласніка асудзілі, а млын забралі ў калгас. Дарэчы, ён яшчэ некаторы час працаваў па сваім прызначэнні.

Таму захаванасці будынка паспрыяла не толькі яго зацішнае месца, але і сама канструкцыя. Большая частка сцяны складзена з бутавых камянёў. Іх і дастаўляць цяжка, і выкарыстаць потым асабліва няма дзе. Новы ўласнік мяркуе стварыць тут цікавы турыстычны аб'ект. Нараджэнню такой ідэі потым паспрыяла наяўнасць вадаёма. Сапраўды, побач з млынам раскінулася маляўнічае возера, на якое падчас нашай гутаркі прыляцеў лебедзь. Аказалася, гэтыя птушкі жывуць тут пастаянна, а сёлета ў пары было заўважана шэсць птушанят. Гэта цяпер Яўген з гонарам паказвае свае ўгоддзі, а спачатку нават не ведаў, з чаго пачынаць.

Перш-наперш была праведзена татальная ачыстка тэрыторыі — літаральна па ўсім участку. Асабліва праблемнае аказалася возера. Дарэчы, яно таксама прысутнічае на карце XVIII стагоддзя. А вось смецце ад навакольных дач і катэджаў — на жаль, прыкмета нашага часу. Фермер ачысціў возера і плануе яго зарыбіць. Увогуле на гэты аб'ект у яго вялікія планы.

Але асноўныя спадзяванні Яўген Дарагуш звязвае менавіта з млыном. Яго мэта — паказаць унікальныя старажытныя механізмы ў дзеянні. Падобны музей можа стаць адзіным такім у Гродзенскім рэгіёне. Сёе-тое тут ужо зроблена. Па-першае, аднаўлены дах, ачышчаны турбіна і наогул уся тэрыторыя.

Фермер праводзіць невялікую экскурсію па гістарычным аб'екце і расказвае аб далейшых планах. На сённяшні дзень ідуць работы па наладжванні электрыкі, каб зрабіць падсветку пад экспанаты.

— На другім паверсе мы бачым машыну для раздзялення зерня ад прымесяў. Ёсць тут стары вальцовы станок, прыстасаванне для атрымання крупы з зерня. Дапоўняць музей цікавыя экспанаты, знойдзеныя з дапамогай металашукальніка, — тлумачыць Яўген. — Усё жалезнае тут даўно вывезена, а драўлянае абсталяванне засталося з-за яго вялікіх памераў. Напрыклад, ёсць станок на тры тоны, яго можна вывезці толькі з кранам. Быў яшчэ жалезны механізм, яго выбівалі ломам...

З набыццём млына ў фермера-праграміста раптам прачнуўся вялікі інтарэс да падобных аб'ектаў. Ён настолькі зацікавіўся імі, што нават стаў удзельнікам міжнароднага сімпозіума па маліналогіі — навукі, якая займаецца вывучэннем млыноў і іх механізмаў. Кожныя чатыры гады ў розных краінах збіраюцца такія ж аматары і расказваюць, хто што аднавіў, якія правёў даследаванні. На апошнім такім сімпозіуме ў Берліне, дзе сабралася каля 400 удзельнікаў, гродзенец быў першы (!) прадстаўнік з Беларусі за ўвесь час існавання гэтага аб'яднання. Паездка аказалася цікавая менавіта з пункту гледжання рэканструкцыі млына. Яўген даведаўся, як весці гэтую работу са старымі механізмамі, тым больш што гродзенскі аб'ект аказаўся ўнікальным з-за гарызантальнай турбіны. Але і такія цікавыя аб'екты знікаюць з-за іх незапатрабаванасці, альбо іх прыстасоўваць пад асабістыя патрэбы. Праз гэтыя разважанні прайшоў і сам Яўген.



— Былі прапановы зрабіць з млына жылы дом, але я лічу, што гэта вар'яцтва, — лічыць фермер. — Да таго ж, пабудаваць новае жыллё значна танней — нават аграсядзібу. Таму я вырашыў аднавіць гэты аб'ект у яго першапачатковым выглядзе. На жаль, старыя млыны паціху знікаюць, і гэта не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце. У найлепшым выпадку іх выкарыстоўваюць як турыстычныя аб'екты, частку з іх перабудоўваюць пад жыллё. У Германіі і Галандыі такіх безліч. Але многія стаяць закінутыя. Гэта сусветная тэндэнцыя. Калі яны не рэнтабельныя, ніхто не будзе імі займацца.

Яўген не тоіць, што ў яго ёсць жаданне давесці справу да канца. Паралельна развівае і сваю фермерскую гаспадарку. На выдзеленым участку вырошчвае ягады годжы. Каля возера мяркуе пабудаваць домік рыбака, праект якога ўзгоднены з мясцовымі ўладамі. Тады з'явіцца дадатковы камфорт для тых, хто жадае адпачыць на беразе возера, парыбачыць, зрабіць шашлыкі. Фермер не забараняе гэта рабіць і цяпер. Галоўнае, кажа ён, каб не пакідалі пасля сябе смецця. Аб чым папярэджваюць і шыльдачкі з адпаведным подпісам. Праход да млына таксама вольны. Дарэчы, гэты аб'ект мяркуецца ўключыць у турыстычны маршрут «Шляхам Тызенгаўза», рэалізацыя якога вядзецца ў рамках трансгранічнага праекта.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Дзеля памяці

## З ШУКАЛЬНІКАЎ ІСЦІНЫ

**Памёр былы «звяздовец», празаік, публіцыст Славамір АНТАНОВІЧ**

Нарадзіўся ў 1955 годзе ў Шчучынскім раёне. Пасля вучобы ў Мінскім радыётэхнічным інстытуце ў роднай старонцы і працаваў некаторы час — на Шчучынскім масласырзаводзе, у Шчучынскім райкаме КПБ.

Яшчэ са школьнага юнацтва пісаў заметкі, карэспандэнцыі для мясцовага друку. З 1986 года — у журналістыцы. Спярша — у «Мінскай праўдзе». Затым — у «Звяздзе». Выступаў з артыкуламі, нарысамі ва ўсесаюзных газетах (у «Правде», «Советской России», «Сельской жизни»). У пярэдадзень развалу Савецкага Саюза працаваў памочнікам першага сакратара ЦК КПБ. Пасля — дарадцам старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Завочна закончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў ва ўрадзе, затым — у Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь.

З пачатку 1990-х гадоў Славамір Антановіч актыўна займаўся літаратурнай працай. Адна за другой пабачылі свет яго кнігі — «Пётр Машэраў», «Прывіды Мажэйкаўскай крэпасці», «У жніўні дзевяноста першага...», «Дыверсант Сталіна», «Лёс да запатрабавання», «Жыццё па-за законам» і іншыя. Іх дакументальная аснова прыцягвала чытача.

За творчыя здзяйсненні пісьменнік адзначаны прэміяй Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро». Славамір Антановіч — лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Залаты купідон», заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў.

**Рэдакцыя «Звязды» прыносіць шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўра абышоў долар у глабальных плацяжах

Еўрапейская валюта ўпершыню з лютага 2013 года апярэдзіла долар і выйшла на першае месца па долі ў глабальных плацяжах. Як перадае Bloomberg са спасылкай на даныя SWIFT, у кастрычніку 37,82 % усіх грашовых пераводаў, якія абслугоўваюцца сістэмай, было праведзена ў адзінай валюце ЕС. На другім месцы долар (37,64 %). На трэцім — брытанскі фунт (6,92 %). Пры гэтым выкарыстанне амерыканскай валюты скарацілася за год на 4,6 працэнтнага пункта. Нягледзячы на тое, што долар страціў першае месца ў SWIFT-плацяжах, ён працягвае быць лідарам сярод усіх рэзервовых сусветных валют, з'яўляючыся сродкам глабальных гандлёвых разлікаў. Так, згодна са справаздачай Банка міжнародных разлікаў, каля 50 % усіх трансгранічных пазык і міжнародных аблігацый намінавана ў доларах. Акрамя таго, амаль 85 % усіх транзакцый на рынку Forex таксама праводзіцца з амерыканскай валютай. Таксама вядома, што палова гандлёвых рахункаў-фактур у свеце выстаўляецца ў доларах.

### У Сеуле заявілі пра пачатак трэцяй хвалі каранавіруса



У сталіцы Паўднёвай Карэі пачалася трэцяя хваля каранавіруснай інфекцыі, заявіў на брыфінгу прадстаўнік міністэрства аховы здароўя Юн Тэ Хо. Яго працытавала выданне The Korea Herald. Чыноўнік заўважыў, што цяпер назіраецца ўздым захваральнасці ў параўнанні з тым становішчам, што адзначалася ў лютым-сакавіку і жніўні. Таму органы аховы здароўя апублікуюць рэкамендацыі па карэкціроўцы ўзроўню сацыяльнага дыстанцыявання, каб муніцыпальныя ўлады маглі больш эфектыўна спраўляцца з сітуацыяй. «Павышэнне ўзроўню эфектыўнае для стрымлівання віруса, але паколькі гэта можа таксама паўплываць і на эканоміку, яны павінны цвяроза ацаніць рызыкі і сітуацыю з вірусам», — дадаў Юн Тэ Хо. Зараз у Сеуле і Кванджу ўзровень сацыяльнага дыстанцыявання паднялі да 1,5. У такім выпадку, акрамя базавых мер засцярогі, уводзяцца абмежаванні на сходы ў сто і больш чалавек. Акрамя таго, абмежавана дзейнасць «небяспечных» аб'ектаў, якія наведвае шмат людзей.

### Названыя найгоршыя паролі года




Менеджар пароляў NordPass склаў штогадовы спіс самых ненадзейных сакрэтных камбінацый карыстальнікаў інтэрнэту. Лідарам антырэйтынгу NordPass стаў «123456», які сёлета выкарыстоўвалі звыш 2,5 мільёна разоў. На другім месцы апынулася «ўскладненая версія» першага варыянту — «123456789», выкарыстаная амаль мільён разоў. На трэцім радку размясціўся пачатковец рэйтынгу — «picture1». Астатнія месцы ў топ-10 занялі «password», «12345678», «111111», «123123», «12345», «1234567890» і «senha». За выключэннем «picture1», усе паролі з першай дзясяткі падбіраюцца кіберзлачынцамі менш чым за дзесяць секунд, адзначае NordPass. Паведамляецца, што людзі таксама часта выкарыстоўваюць назвы гуртоў, фільмаў, мультфільмаў і іншых аб'ектаў поп-культуры ў якасці пароляў, аднак такія камбінацыі таксама лічацца небяспечнымі. Пры гэтым, як адзначаюць у NordPass, частае выкарыстанне падобных пароляў можа сігналізаваць аб з'яўленні канкрэтных трэндаў у грамадстве.

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

*Зарэчча Камянецкага раёна*




# ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ВАЙНЫ НА ПАМЕЖЖЫ

**Вера Паўлаўна і Уладзімір Якаўлевіч Казыры ўжо 67 гадоў разам. Жывуць яны ў згодзе і з вялікай пяшчотай і клопатам ставяцца адно да аднаго, адно аднаго падтрымліваюць. Гэта адчуваецца ва ўсім. Вера Паўлаўна нібы ўшчувае мужа за тое, што той столькі інфармацыі носіць у галаве, «не раўнуючы як той камп'ютар», але ж за гэтымі словамі хаваецца яе гонар, яе захапленне чалавекам, з якім пражыла столькі часу.**

## СЛУЖЫЎ УЗОРНА

Пакахалі яны адно аднаго зусім маладыя. І пажаніліся адразу. Уладзіміру было толькі васямнаццаць, Веры — на год больш. Але ж іншых хлопцаў у войска праводзілі бацькі, а яго ўжо — маладая жонка. Было гэта ў далёкім 1955 годзе. Уладзімір Якаўлевіч згадвае службу, нібы з кнігі чытае:

— У «вучэбку» трапіў у Мар'іну Горку, дзе камандзірам палка быў Кузняцоў, удзельнік двух парадаў на Краснай плошчы, а потым мяне накіравалі ў Асіповічы. Служыў у 94-м гвардзейскім двойчы Чырванасцяжным ордэна Аляксандра Неўскага, ордэнаў Кутузава і Суворава Пражскім палку.

— Вой, як ён усё памятае, проста дзіва, — пляснула далонямі Вера Паўлаўна. — Лепш раскажы, як я да цябе прыязджала, а камандзір роты прыходзіў на вакзал мяне сустракаць.

— Было такое, — усміхаецца былы вайсковец. — Нядрэнны баец, значыць, быў, калі радавому салдату дазвалялі спатканні з жонкай, некалькі дзён на гэта давалі. Перад дэмабілізацыяй прапаноўвалі застацца ў арміі. Падумваў аб гэтым, але жонка не згадзілася, таму адслужыў і вярнуўся. Жыццё сямейнае будавалі ў сваёй вёсцы, як цяпер кажуць, на малой радзіме.

## ЯК АФІЦЭР КАРЧАГІН СЯМ'Ю РАТАВАЎ

Цікава, што абое помняць вайну. І абое ўспомнілі менавіта першы дзень, 22 чэрвеня. У 1941-м годзе мае героі былі па ўзросце вучнямі недзе першага-другога класаў.

Вёска іх стаіць на самым памежжы. Вакол размяшчаліся вайсковыя часці і пагранічныя заставы, сем'і афіцэраў найчасцей кватаравалі ў вяскоўцаў. У бацькоў Веры таксама жыла такая сям'я па прозвішчы Карчагіны. У іх было трое дзетак, меншае — некалькі тыдняў, як нарадзілася. «Ранічкай у нядзелю ўсе ў доме спалі, як бацька зайшоў на палавіну кватарантаў і сказаў, што за рэчкай нешта грукае, нібы бомбы кідаюць, мабыць, вайна пачалася, — згадвае Вера Паўлаўна дзень, што навечна засеў у памяці. — А кватарант не паверыў, яшчэ прыкрыкнуў, маўляў, няма чаго паніку разводзіць, гэта навальніца грукоча. Ды пакуль усе паўставалі, жанчыны дзяцей пакармілі, прыбегла суседка і з парога: «Немцы ў вёсцы!» Тая, аказалася, убачыла першых матацыклістаў. Ну, і пабег наш камандзір кудысьці, толькі жонцы загадаў сабраць дзяцей. Аказалася, падаўся у часць, вярнуўся вельмі хутка з танкам і дзвюма бронемашынамі. «Значыць, ён быў не малодшы афіцэр, а ў добрым чыне», — заўважае галава сям'і. Адным словам, жонку з дзецьмі ён пасадзіў і паспеў вывезці літаральна пад абстрэлам і дамчаў да чыгуначнай станцыі. Пазней, пасля вайны, яна прыязджала да нас, мама ўсе іх рэчы зберагла, захавала. А ён, як і многія, загінуў на фронце. Да гэтай пары памятаю іх адрас у Кастрамской вобласці, — гаворыць Вера Казыра.


Вера і Уладзімір КАЗЫРЫ.

## ПРАРОЦТВЫ ДЫВЕРСАНТА І АКУПАНТА

Уладзімір Якаўлевіч згадаў суботу перад вайной. Яны з хлопчыкамі бегалі ў суседнюю вайсковую часць, там паказвалі кіно. Для вясковых дзяцей гэта было амаль за свята. Яшчэ трэба было трапіць пад добры настрой палітрука, каб цябе пусцілі ў часць на кінасеанс для байцоў... Але ж яны ўмудраліся... І вось пасля фільма па дарозе дадому ім сустрэліся афіцэры на конях, не зусім звычайныя. Хлопчыкі звярнулі ўвагу, што форма ў іх была новая, як з іголачкі, і самі надта ж дагледжаныя, у адрозненне ад тых афіцэраў, якіх яны бачылі ў часці. Вайскоўцы размаўлялі, смяяліся, спыталі дзяцей: «Ну што, спадабалася вам кіно?» Тыя адказалі, што вельмі. «Заўтра будзе яшчэ цікавейшае», — прамовіў адзін з іх. Праз многа гадоў Уладзімір зразумеў, што гэта былі дыверсанты, і гаварылі яны пра зусім іншае «кіно», якое спасцігла нас 22-га чэрвеня. Потым людзі расказвалі пра іншых дыверсантаў, што сядзелі ў Павуках на могілках яшчэ з пятніцы. Асаблівасці памежжа...

— А ў нядзелю немцы спакойна ўвайшлі ў нашу вёску, размясціліся, сталі ўмывацца каля калодзежа. А вось гэты танк з бронемашынамі, пра які расказала Вера, нарабіў такога перапалоху, што вяскоўцы сталі хапаць зброю, якую саставілі недзе каля плота, і адзін нямецкі салдат у тым вэрхале выпадкова накалоўся на штык-нож. Іх камандзір падумаў на вяскоўцаў. Адразу ж узялі, можа, з дваццаць заложнікаў з ліку вясковых мужчын. Жыццё іх было ўжо на валаску, але ж той пацярпелы салдат чалавекам аказаўся. Літаральна перад тым як сканаць, сказаў, што гэта ён сам выпадкова параніўся, і нашых адпусцілі. Вось так вайна для нас пачыналася, — расказвае Уладзімір Якаўлевіч. — І яшчэ ў той дзень да нас у хату зайшоў немец, які добра гаварыў па-польску, пачаў распытваць дзеда, як мы тут жывем. А дзед паказаў на мяне: «Вось па вашай міласці сірата расце». Майго бацьку перад самай вайной прызвалі на зборы ў Войска Польскае, дзе ён раней служыў. І забілі ў першыя дні акупацыі Польшчы. Бацьку было тады 29 гадоў. Вось дзед і падзяліўся сваімі горам і крыўдай. А немец падняў палец літаральна перад дзедавым носам і сказаў: «Памятай, Гітлер пайшоў на Расію і знойдзе там магілу». Потым папярэдзіў, калі дзед каму-небудзь скажа пра гэтую размову, яму не паверыць, больш за тое, расстраляюць. Мне было строга забаронена нават згадваць каму-небудзь пра тое, што пачуў. А хто быў той немец і чаму ён так гаварыў, для мяне загадка па сённяшні дзень. Ясна адно, усялякія людзі былі і сярод іх.

Вось так і перажывалі людзі вайну. З Зарэчча, у якім пражывала тады 370 чалавек, у 44-м на вайну пайшлі многія. На розных франтах загінула 17 мужчын, вярнулася прыкладна столькі ж. «Я як кладуся спаць, кожны дзень іх успамінаю. Маладыя ўсе ў асноўным, як мой бацька, а то і маладзейшыя. Пайшлі і засталіся, вось што такое вайна, — голас у 84-гадовага чалавека дрыжыць. — Маё пакаленне яе ніколі не забывае».

## АД ТРАКТАРЫСТА ДА БРЫГАДЗІРА

Яны, дзеці ваенных гадоў, заўсёды шмат працавалі. Уладзімір Казыра згадаў, што вучыцца ў школе не змог доўга, бо быў адзіны сын у маці, яе апора. Яшчэ да арганізацыі калгаса людзей абклалі падаткамі, трэба было вырасціць нешта на полі, прадаць, заплаціць. Падлеткам вазіў прадукты ў Брэст на базар, потым маці несла грошы ў сельсавет. І вечна ім з маці не хапала, каб разлічыцца цалкам, усё ім гаварылі пра нейкія даўгі. Сямігодку скончыў пазней у вячэрняй школе. А калі ў 1951-м арганізавалі калгас, пайшоў вучыцца на трактарыста. Больш за 15 гадоў працаваў на трактары з перапынкам толькі на армейскую службу. Але здольнага да навукі хлопца заўважылі і паслалі на вучобу. Завочна атрымаў дыплом агранома. Пасаду агранома прапанаўвалі ў аб'яднаным калгасе, але гэта вымагала пераезду. Ды на сямейным савеце вырашылі не мяняць месца жыхарства. Прывыклі да свайго дома, тут нарадзіліся і падраслі дзеці, тут была немалая свая гаспадарка. Ну і засталіся, а галаве сям'і даверылі ўзначальваць брыгаду. Так 26 гадоў і адпрацаваў брыгадзірам да самай пенсіі.

Што кар'еру калгаснага спецыяліста не зрабіў, не шкадуе. Жонцы ва ўсім памагаў. Яна працавала і швачкай, і загадчыцай комплекснага прыёмнага пункта, забяспечвала бытавымі паслугамі насельніцтва. Як усе навокал, трымалі карову, свіней, вялікі агарод. Свая гаспадарка заставалася, бывала, цалкам на ім, асабліва ў выхадныя дні, калі Вера Паўлаўна як работнік службы быту была задзейнічана на выязным гандлі. Ездзілі гандляваць у вялікія вёскі, у Брэст, ва ўкраінскія гарады. Згадала такі выпадак, калі ў горадзе на адным з выязных кірмашоў у яе ўкралі куртку. Гэта была вялікая страта для яе невысокай зарплаты. Але жанчыну як работніка настолькі цанілі, што раённае кіраўніцтва выпісала прэмію, каб кампенсаваць кошт тавару.

А ў вёсцы брыгадзір быў той асобай, да якой усе ішлі з рознымі пытаннямі. І не толькі калі справа датычылася сенакосу альбо надзелу сотак пад бульбу. Яго і зараз называюць брыгадзірам. Таму не дзіва, што аднадушна абралі старастам вёскі. Вось толькі «брыгада» ўжо далёка не тая. З вялікага ў свой час населенага пункта са школай, клубам, магазінам Зарэчча стала зусім маленькай вёсачкай. Цяпер тут стала пражывае нейкі дзясятак чалавек. Праўда, нямала дамоў ажываюць летам, калі прыязджаюць дачнікі.

Вера Паўлаўна ж з Уладзімірам Якаўлевічам — яшчэ надзвычай актыўныя і рухавыя для сваіх гадоў. Зранку гаспадынька схадзіла ў лес і набрала позніх восеньскіх грыбоў. На зіму назапасілі яблыкаў і грэцкіх арэхаў з уласнага саду. Сваю няхітрую дамашнюю гаспадарку паспяхова вядуць самі. А ў выхадныя чакаюць дзяцей — дочкі жывуць у Брэсце. Унукі таксама па гарадах. У пары ёсць ужо нават праўнукі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

З нагоды

# Роднаму краю і яго людзям

**Аўтара «Пісьмаў вайны», укладальніка «Астрамечаўскага рукапісу» пісьменніка Аляксандра ВАЛКОВІЧА павіншавалі з юбілеем у Брэсцкім раёне**

Найбольшую вядомасць брэсцкаму пісьменніку Аляксандру Валковічу прынесла кніга пад назвай «Пісьмы вайны». Матэрыялы для кнігі аўтар збіраў доўга. Сустракаўся з роднымі франтавікоў, перапісваў лісты з вайны ад рукі, сканіраваў і фатаграфаваў, збіраў гісторыі людзей на вайне ва ўсіх раёнах вобласці, працаваў у архівах і музеях. Кніга выйшла да 65-й гадавіны Перамогі. А другое, дапоўненае выданне ўбачыла свет летась. Там аўтар апублікаваў успаміны сваёй маці, якая была адпраўлена на прымусовыя работы ў Германію. Для яго, сына франтавіка, паводле ўласнага прызнання, гэтая кніга мае асаблівыя значэнне і сэнс.

Сёння ж асноўная творчая дзейнасць пісьменніка звязаная з альманахам «Астрамечаўскі рукапіс», які выходзіць з 2013 года ў Брэсцкім раёне. Краязнаўчы альманах даўно стаў своеасаблівым культурным брэндам раёна ў многім дзякуючы руплівасці і настойлівасці яго ўкладальніка. Таму ў раённы Дом культуры павіншаваць пісьменніка з 70-годдзем прыйшло нямала гасцей.

Празаіка, публіцыста, даследчыка гісторыі роднага краю ўганаравалі старшыня райсавета дэпутатаў Уладзімір Хвацік, намеснік старшыні райвыканкама Павел Валынец, дырэктар ААТ «Астрамечава» Алег Бурак. Добрыя словы на яго адрас сказала старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Дзямідовіч. Яна адзначыла, што Аляксандр Міхайлавіч, аўтар шэрагу кніг і публіцыстычных артыкулаў, адзначаны Брэсцкай абласной літаратурнай прэміяй імя У. Калесніка, многімі рэспубліканскімі і міжнароднымі ўзнагародамі. Яго кнігі, прысвечаныя роднаму краю і яго людзям, палюбіліся чытачу. Удзельнікі імпрэзы пажадалі літаратару плённай працы і новых твораў.


Намеснік старшыні райвыканкама Павел ВАЛЫНЕЦ віншуе Аляксандра ВАЛКОВІЧА.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Праекты і рашэнні

# ПАНЭЛЬ ДЛЯ ФАТОНАЎ

## Другая па магутнасці сонечная электрастанцыя будзе пабудавана ў Гродзенскай вобласці

**Праект бярэцца ажыццявіць новы рэзідэнт СЭЗ «Гроднаінвест» з Ірландыі. Прадпрыемства «Скайват» зарэгістравана ў кастрычніку гэтага года. Інвестыцыйны праект прадугледжвае будаўніцтва фотаэлектрычнай станцыі для энергетычнага забеспячэння рэзідэнтаў СЭЗ.**

Як расказалі ў адміністрацыі СЭЗ, сетка фотаэлектрычнай станцыі будзе размеркавана на зямельных участках свабоднай эканамічнай зоны. Агульная магутнасць комплексу звыш 12 МВт. Згодна з праектам, аб'ём інвестыцый складзе больш за 5 мільёнаў еўра. У склад комплексу ўваходзяць дзясяткі тысяч фотаэлектрычных панэляў з акумулятарамі, дзе назапашваецца сонечная энергія.



Гэта другая па магутнасці сонечная станцыя ў Гродзенскай вобласці. Па інфармацыі Гродзенскага абласнога ўпраўлення па наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў Дэпартамента па энергаэфектыўнасці РБ, у Смаргонскім раёне дзейнічае фотаэлектрастанцыя, магутнасць якой складае амаль 18 МВт. А ўсяго ў рэгіёне 16 электрастанцый, якія працуюць ад сонечнай энергіі. З пачатку года імі атрымана 27 мільёнаў кВт электраэнергіі. Невялікія станцыі функцыянуюць на тэрыторыі некаторых беларускіх прадпрыемстваў.

Праз некалькі гадоў «зялёную» электраэнергію змогуць атрымаць і спажыўцы ірландскага рэзідэнта СЭЗ «Гроднаінвест». Падлічана, што ўвод станцыі дазволіць прадпрыемствам знізіць сабекошт прадукцыі. У адміністрацыі СЭЗ падкрэслілі, што гэта важна і для развіцця кааперацыйных сувязяў з міжнароднымі канцэрнамі, якія скіраваны на пашырэнне выкарыстання энергіі з аднаўляльных крыніц.

Трэба сказаць, што ірландскія кампаніі з аналагічнымі праектамі прыйшлі не толькі ў Гродна. Сёлета інвестары маюць намер будаваць такія станцыі і ў іншых СЭЗ, у прыватнасці Віцебску і Брэсце. Праўда, іх магутнасці меншыя.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота дадзена СЭЗ «Гроднаінвест».**

# КІНАГЕРОІ РАЯЦЬ

### Захаванне масачнага рэжыму правакантралявалі ў брэсцкім кінатэатры «Беларусь»

Работнікі Брэсцкага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правялі маніторынг захавання масачнага рэжыму ў кінатэатры «Беларусь», падчас якога адзначана, што ва ўстанове выконваюцца ўсе патрабаванні, прадыктаваныя эпідсітуацыяй. Дастаткова антысептыку. Усе супрацоўнікі ў масках, наведвальнікаў папярэджваюць аб неабходнасці насіць маску. У самой глядзельнай зале выкарыстоўваецца дыстанцыйная рассадка. Месцы, якія не прадаюцца, абазначаныя адпаведным чынам. А яшчэ ёсць наглядная рэклама ад кінагероеў, якая павінна прыцягнуць увагу наведвальнікаў.



У сваім тэлеграм-канале мэр горада Аляксандр РАГАЧУК паведамляе, што такія рэйды ва ўстановы горада цяпер стануць рэгулярнымі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Аляксандра Рагачука.**

# ГАЗ «З ТРУБЫ» ЦЯПЕР І Ў ПРЫГАРАДЗЕ ВІЦЕБСКА

**У вёсцы Сасноўка Віцебскага раёна, якая прыкладна за 14 кіламетраў ад абласнога цэнтра, прэзентавалі цэнтралізаваную падачу прыроднага газу. У цырымоніі браў удзел старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ.**

На «газ з трубы» ўжо перавялі каля трыццаці кватэр з двух жылых дамоў у населеным пункце.

Перспектыва далейшай газіфікацыі вёскі: больш за трыста прыватных домаўладанняў, а таксама рэспубліканская бальніца, дзе лечаць пацыентаў з туберкулёзам, і база адпачынку.

Даўжыня газаправода складае каля сямі кіламетраў. Агульная працягласць у Віцебскім раёне газавых сетак перавышае 1,6 тысячы км. Газ падведзены ў 71 сельскі населены пункт, у тым ліку 16 аграгарадкоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЛЯ КРЫЛАТЫХ МАШЫН

### Аршанскі аэрадром прайшоў сертыфікацыю

**Цяпер у прыгарадзе Оршы могуць прызямляцца і ўзлятаць крылатыя машыны розных тыпаў. Гэта стала магчыма пасля таго як днямі Дэпартамент па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый выдаў сертыфікат прыдатнасці да эксплуатацыі.**

Акт аб адпаведнасці характарыстык аэрадрома, яго абсталявання і сродкаў забеспячэння палётаў сертыфікацыйным патрабаванням быў падпісаны пасля выкanання тэхнічнага рэйса на самалёце Boeing 737-500 авіякампаніі «Белавія».

Аэрадром пад Оршай можа прымаць розныя тыпы паветраных суднаў, у тым ліку шырокафюзеляжныя: А-330, А-340, У-747, У-767, а таксама верталёты ўсіх тыпаў у любы час сутак.

Цікава, што ў савецкі час на гэтым аэрадроме, пабудаваным яшчэ пасля вайны, базіраваліся бамбардзіроўшчыкі стратэгічнага прызначэння.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»** сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 27 ноября 2020 года 293-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (опубликовано в газете «Звязда» 27.10.2020):

- предмет аукциона № 62 исключается из текста публикации в связи с отказом арендодателя от проведения аукциона.

**Телефон для справок +375 (17) 360 42 22.**
**Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.**
УНП 190398583



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей от 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А. Тел./факс (8017) 361 67 99; (8017) 399 53 94; (8017) 370 84 18, (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник, среда с 8.45 до 13.00; вторник, четверг с 14.00 до 18.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1) Жилой дом № 27 по ул. Маршала Лосика;
2) Жилой дом № 29 по ул. Маршала Лосика;
3) Жилой дом № 15 по ул. Юрия Семеняко;
4) Жилой дом № 6 по ул. Маршала Лосика;
5) Жилой дом № 14 по ул. Маршала Лосика;
6) Жилой дом № 4 по ул. Малакович.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы РУП «Главгосстройэкспертиза» от 17.07.2019 № 310-15/19;
- решения Мингорисполкома от 16.04.2020 № 1219 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 18.11.2020 № 2-208Ж-034/20;
- договор строительного подряда от 09.11.2020 № 09-11/2020 с ОАО «МАПИД».

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Многоквартирный жилой дом № 5/2 по генплану в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4. (5-я очередь строительства)».

127-квартирный жилой дом запроектирован на базе номенклатуры индустриальных изделий серии М 464-М 16-этажным, двухсекционным, с техническим подпольем и чердаком, встроенным на 1-м этаже помещением товарищества собственников (ПТС), плоской рулонной кровлей и организованным внутренним водостоком. В каждой секции запроектированы одна незадымляемая лестничная клетка и два лифта, габариты кабины одного из которых приняты не менее 1,1 х 2,1 м.

Внутренняя отделка:

стены – обои (жилые комнаты, прихожие, коридоры квартир, кухни); акриловая покраска (санузлы);

потолки – акриловая покраска (квартир);

полы – керамическая плитка (санузлы); линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове (жилые комнаты, коридоры квартир, кухни, кладовые);

окна – профиль ПВХ, заполнение – стеклопакеты;

двери – межкомнатные деревянные, входные в квартиры стальные.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, преимущественно многодетных семей, по направлениям администраций районов г. Минска:

- 2 (две) однокомнатные квартиры;
- 62 (шестьдесят две) двухкомнатные квартиры;
- 63 (шестьдесят три) трехкомнатные квартиры.

Цена 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства в жилом доме № 5/2 по генплану на дату опубликования проектной декларации с учетом прогнозных индексов составляет: для нормативной площади – 1 694,95 бел. рубля; для площади, превышающей нормативную – 2 050,00 бел. рубля.

Начало строительства – ноябрь 2020 года.

Планируемый срок ввода объекта в эксплуатацию – январь 2022 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 102.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента получения договора до 25 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.



УНП 600048461

И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СМОЛЕВИЧСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА**

***(составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой жилой дом с верандой, сараем)***

**общей площадью 75 кв. м с инв. № 614/С-27137, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624882505601000087 *(право постоянного пользования)* площадью 0,2231 га по адресу: Минская область, Смолевичский район, Курганский сельский совет, д. Кленник, ул. Полевая, д. 15.**

**Начальная цена** без НДС – **53 934,54** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **5 393,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.01.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: 8 (017) 516-80-64, 516-80-65, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронный торгов:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец:** ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17 | |
| **Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б | |
| **Адрес ЭТП:** www.ipmtorgi.by | |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1 – магазин встроенный** (Административно-торговое помещение мазазин встроенный) общей площадью 368 кв. м, инв. номер 240/D-36384, по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75-137 | |
| **Начальная цена с НДС 20 %: 103 200,00 белорусского рубля (BYN)** | |
| **Лот № 2 – выставочный зал «Лань», расположеный на 1-2-ом этажах** (административно-торговое помещение выставочный зал «Лань») общей площадью 534,4 кв. м, инв. номер 240/D-36385, по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75-138 | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 147 600,00 белорусского рубля (BYN)** | |
| **С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронный торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** 30 (тридцать) рабочих дней после электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Условия аукциона:** покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан возместить Продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона в размере 312,06 бел. руб. по каждому лоту отдельно | |
| **Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Республіка» 23.10.2020 г.** | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет электронных торгов с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| **Дата, место и время проведения электронных торгов** **Начало торгов – 11.00 02.12.2020 г.** **Окончание торгов – 12.00 02.12.2020 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата, место и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.12.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Мікалай ЗАПРУДСКІ:

# «Вера ў дзіця — галоўны падарунак»

## Для паспяховых школ характэрны клімат высокіх чаканняў

**Прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ЗАПРУДСКІ — сапраўдная зорка ў прафесійнай супольнасці. Вось ужо больш як 30 гадоў яго метадычны летнік на беразе ракі Страча каля вёскі Альхоўка праходзіць з нязменным аншлагам. За гэты час ідэя павышэння кваліфікацыі на ўлонні прыроды знайшла шмат прыхільнікаў і абрасла мноствам цікавых традыцый. Трапіць у «зялёны клас» марацць многія, але конкурс складае два-тры чалавекі на месца. Да таго ж Мікалай Іванавіч з'яўляецца кіраўніком інавацыйных праектаў, ментарам дыстанцыйных курсаў па медыяадукацыі і актыўнай ацэнцы. А яшчэ прафесар Запрудскі — пастаянны член журы Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года». Таму нядзіўна, што менавіта ён стаў героем першай праграмы «Размовы пра адукацыю».**



### КЛЮЧАВЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ

— Я ўваходжу ў журы з самага першага конкурсу, які адбыўся ва ўжо далёкім 1990 годзе, — расказвае ён. — Таму магу параўноўваць, як на працягу трох дзесяцігоддзяў змяняліся нашы канкурсанты. У 90-я гады настаўнікі мусілі дэманстраваць, якія яны эрудзіраваныя, якія разумныя, як умеюць данесці да дзяцей вучэбны матэрыял сучаснымі сродкамі. Але за апошняе дзесяцігоддзе намецілася іншая тэндэнцыя. Канкурсанты найперш імкнуцца прадэманстраваць, як яны ўмеюць арганізаваць работу дзяцей, як працуюць вучні на ўроку пад іх кіраўніцтвам. І гэта класна, таму што якасць адукацыі напрамую залежыць ад таго, наколькі актыўныя на ўроку дзеці, бо калі настаўнік клапоціцца толькі аб тым, каб данесці свой матэрыял, то ўрок ператвараецца ў тэатр аднаго акцёра. Сучасным дзецям не надта цікавы настаўнік, які проста ўмее пераказваць матэрыял, таму што яны ўсё могуць знайсці ў інтэрнэце. Ім патрэбны той, хто цікава арганізуе іх работу. Вымушаны канстатаваць, што настаўнікі сёння вельмі адрозніваюцца і мэтамі, і каштоўнасцямі, і ўзроўнем падрыхтаванасці.

> **«Самы галоўны падарунак, які мы можам зрабіць нашым дзецям, — гэта глыбокая перакананасць у тым, што яны могуць стаць паспяховымі».**

Пачатак 90-х гадоў быў цікавы тым, што старыя каштоўнасці ўжо сышлі, а новыя яшчэ не сфарміраваліся, і школа аказалася даволі аўтаномнай і самастойнай пляцоўкай, дзе ў настаўнікаў з'явілася шмат прасторы для творчасці. Гэта вельмі каштоўна. Уявіце сабе, што ўсе педагогі будуць працаваць толькі па прапісаных у розных дакументах нарматывах, якія дэ-юрэ замацоўваюць тое, што ўжо існуе дэ-факта. Але каб рушыць наперад, трэба выходзіць за рамкі і рабіць па-іншаму. Таму і існуюць інавацыйныя пляцоўкі, якія штогод зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі. У такіх школах дазволена тое, што пакуль нарматыўна нідзе не прапісана. Гэта фактычна палігоны, дзе апрабоўваецца перадавы педагагічны досвед, які затым транслюецца на ўсю краіну.

Ад сучасных настаўнікаў асабіста я чакаю мабільнасці і пастаяннага развіцця. Ключавымі кампетэнцыямі ў XXI стагоддзі з'яўляюцца крытычнае мысленне, крэатыўнасць, камунікацыя і кааперацыя. Каб развіваць гэтыя кампетэнцыі ў вучняў, педагог павінен сам імі валодаць. Але мы, настаўнікі, прывыклі працаваць на тое, што правяраецца на ЦТ, падчас маніторынгу, міністэрскай кантрольнай работы і гэтак далей. А кампетэнцыі правярае міжнароднае даследаванне адукацыйных дасягненняў 15-гадовых падлеткаў PISA. Яно праводзіцца толькі раз на тры гады. Ахоплівае не ўсіх, таму на развіццё кампетэнцый скіраваны мала хто з нашых настаўнікаў.

### ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РОЗДУМУ

Мікалай Запрудскі прызнаўся: чакаў, што вынікі, якія прадэманструюць беларускія падлеткі падчас першай спробы ўдзелу краіны ў PISA, будуць горшыя, чым у рэшце рэшт атрымалася. Нагадаем, што нашы школьнікі аказаліся недзе ў сярэдзіне сусветнага рэйтынгу. «Але гэта не падстава для таго, каб супакойвацца», — падкрэслівае ён.

У даследаванні дзецям прапануюцца заданні шасці ўзроўняў складанасці: пяты і шосты — самыя высокія. Дык вось, толькі зусім нязначны працэнт беларускіх школьнікаў з імі спраўляецца. Заданні пятага і шостага ўзроўняў па матэматыцы выканалі 7 % навучэнцаў, па прыродазнаўчых навуках — 3 % і толькі 4 % справіліся з заданнямі на разуменне тэксту. Трэба расттлумачыць, што на гэтых узроўнях вучні могуць засвойваць вялікія тэксты, апераваць абстрактнымі паняццямі, знаходзіць парушэнні ў логіцы, адрозніваць факты ад меркаванняў, ідэнтыфікаваць крыніцы інфармацыі.

Таксама выявілася прамая залежнасць паспяховасці дзяцей у школе ад матэрыяльнага становішча іх сем'яў і адпаведны яму істотны разрыў у ведах.

— Я лічу, што атрыманыя звесткі нельга ігнараваць, — падкрэслівае Мікалай Запрудскі. — Для Германіі іх першы ўдзел у даследаванні PISA ў 2000 годзе закончыўся шокам. Але кіраўнікі сістэмы адукацыі не адмахнуліся ад атрыманых вынікаў і прынялі адпаведныя рашэнні, каб выправіць сітуацыю і зменшыць сваё адставанне ад самых паспяховых адукацыйных сістэм у свеце. У артыкуле 91 Кодэкса аб адукацыі пералічваюцца патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу, сярод іх указваецца на неабходнасць кіравацца ў практычнай дзейнасці кампетэнтасным падыходам. Хацелася б, каб ён дэклараваўся не толькі на паперы, бо краіны, дзе такі падыход стаў нормай у адукацыйным працэсе, дэманструюць высокія дасягненні ва ўсіх міжнародных даследаваннях якасці школьнай адукацыі: PISA, PIRLS, TIMSS.

### НАВОШТА РЭЙТЫНГІ?

Мікалай Запрудскі выказаў наступную думку: раней настаўнікі былі больш адказныя. Цяпер ёсць, напрыклад, каляндарна-тэматычнае планаванне, якое можна проста спампаваць з сайта Нацыянальнага інстытута адукацыі і не напружвацца. А раней педагогі вырашалі самі, калі, што і як яны будуць рабіць на сваіх уроках. Але чым больш мы нарміруем дзейнасць настаўніка і заганяем яго ў пэўныя рамкі, чым больш пішам розных інструкцый, тым меншая будзе яго адказнасць за канчатковы вынік. Затое для прадстаўнікоў кантралюючых органаў ствараецца вельмі зручная прастора для праверак.

Мікалай Запрудскі прызнаўся, што яму вельмі імпануе фінская сістэма адукацыі. Там усё будуецца на даверы. Урад давярае мясцовым муніцыпалітэтам, мясцовыя органы ўлады — дырэктару школы, дырэктар школы — настаўнікам, бацькі — педагогам, а педагогі — дзецям. Адзін з важных момантаў — адсутнасць праверак школ і канкурэнцыі за кошт нейкіх лічбаў. Там няма неабходнасці даказваць, што твая навучальная ўстанова лепшая за суседнюю.

— Калі б была мая воля, то я прыбраў бы з нашай рэчаіснасці ўсе рэйтынгі і спаборніцкія элементы і даў бы школам і настаўнікам большую свабоду дзеяння, — падкрэслівае ён. — Вяртаючыся да таго ж каляндарна-тэматычнага планавання, хачу заўважыць, што Міністэрства адукацыі дазваляе ўносіць у яго змяненні, але ёсць праваральшчыкі, якія лічаць, што ўсё, што выдадзена з грыфам міністэрства, — гэта закон, якім трэба кіравацца. Таму настаўнікі вымушаны ісці на хітрасць: дакументацыю запаўняюць так, каб іх не пакаралі падчас праверак, а на ўроках робяць тое, што лічаць патрэбным.

Давер — вельмі важная ўмова, якая істотна ўплывае на поспехі і вучняў, і педагогаў. Ад навучэнцаў, ацэненых як нядзольныя, настаўнікі не чакаюць паспяховай вучобы. І наадварот, пазітыўны эфект назіраецца тады, калі настаўнік верыць у магчымасць развіцця вучня і дасягнення ім больш высокіх вынікаў.

— Некаторыя настаўнікі сыходзяць са школы пасля размеркавання не толькі з прычыны невысокіх заробкаў, — разважае Мікалай Запрудскі, — а таму, што яны не чулі ад сваіх кіраўнікоў: «Я веру ў цябе. У цябе ёсць педагагічная жылка». Калі працую ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі з намеснікамі дырэктараў і кіраўнікамі ўстаноў адукацыі, то прашу іх: «Часцей гаварыце такія словы сваім падначаленым!»

### АГУЛЬНЫЯ МЭТЫ І КАШТОЎНАСЦІ

— Мне калісьці давялося пазнаёміцца з практыкай эфектыўных школ у ЗША. Пад эфектыўнай маецца на ўвазе ўстанова, якая максімальна задавальняе адукацыйныя запыты заказчыкаў: навучэнцаў, бацькоў, соцыуму і дзяржавы. Даследчыкі вывучалі агульныя характарыстыкі паспяховых школ не толькі ў Амерыцы, але і ў Канадзе і Еўропе, шукалі, што ў іх філасофіі, дзейнасці было агульнае і што адрознівала ад непаспяховых школ. Першая выснова была наступная: эфектыўныя школы мелі моцнага дырэктара — лідара ў арганізацыі адукацыйнага працэсу. У гэтых навучальных установах было моцнае пачуццё місіі агульнай (яе прымалі і падзялялі ўсе работнікі школы). Вельмі важна дасягнуць агульнага разумення мэт, задач і каштоўнасцяў усімі членамі школьнай супольнасці. Адзін са спосабаў пераканацца, што ў школы ёсць ясная мэта, — гэта спытаць у кожнага настаўніка, што больш за ўсё турбуе школу. Вы атрымаеце адзін адказ або шмат розных. І чым больш яны будуць адрозніваца, тым менш узгоднена разуменне місіі школы.

У эфектыўнай школе калектыў верыць і дэманструе, што ўсе навучэнцы могуць авалодаць вучэбным матэрыялам. Школы высокіх вынікаў маюць клімат высокіх чаканняў. Самы галоўны падарунак, які мы можам зрабіць нашым дзецям, — гэта глыбокая перакананасць у тым, што яны могуць стаць паспяховымі.

Яшчэ адна важная характарыстыка эфектыўных школ — партнёрства з бацькамі, калі тыя з'яўляюцца часткай агульнай каманды і падзяляюць адказнасць з педагогамі. Уключыць бацькоў у адукацыйны працэс — задача няпростая. Прыгадваю, як у адной з амерыканскіх школ вырашылі ўцягнуць у сустрэчу абавязкова ўсіх бацькоў, нават тых, хто раней ніколі туды не заходзіў. Былі зроблены маляўнічыя запрашэнні з праграмай. Бацькам абяцалі дэманстрацыю дасягненняў іх дзяцей (і не толькі ў вучэбнай сферы), смачны салодкі стол, падарункі... Праўда, за паўгода да гэтай падзеі педагогам давялося здзейсніць маленькі подзвіг — знайсці падыход да кожнага вучня і дапамагчы дзецям зрабіць нешта выключнае: напісаць верш, камп'ютарную праграму, выйграць конкурс, запісаць сінгл у студыі гуказапісу. Прыйшлі ўсе! Гэта быў пераломны этап, пасля якога пачалося актыўнае ўзаемадзеянне школы і бацькоў, а таксама іх навучанне на спецыяльных семінарах. Трэба дадаць, што школа не можа лічыцца эфектыўнай, калі ў ёй шмат тэхнічных сродкаў, камп'ютарнай тэхнікі, але нізкія агульныя навучальныя дасягненні, або дасягненні розных груп навучэнцаў істотна адрозніваюцца. Важна, каб выніковасць была высокая незалежна ад тэхнічнай аснашчанасці навучальнай установы, полу вучняў, іх этнічнай прыналежнасці, даходаў сям'і і г. д.

### ЛЕКЦЫІ — ДОМА, «ДАМАШКА» — У КЛАСЕ

Мікалай Запрудскі расказаў, што ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі праводзілі апытанне 200 настаўнікаў, дырэктараў школ і іх намеснікаў:

— Ім было прапанавана праранжыраваць розныя формы павышэння кваліфікацыі, сярод якіх згадваліся курсы, семінары, узаемнае навучанне настаўнікаў, адкрытыя ўрокі, наведванне ўрокаў намеснікам дырэктара, самаадукацыя. Нас цікавіла, што мае найбольшы эфект для прафесійнага і асабовага росту педагогаў? На першым месцы аказалася самаадукацыя, а на другім — курсы. Гэта наша рэчаіснасць. 10-11 гадоў у школе, потым 4-5 гадоў ва ўніверсітэце навучалі нас аднолькава. І ў настаўнікаў склаліся пэўныя ментальныя мадэлі: трэба вучыць або індывідуальна, або франтальна. Яны індывідуальна пісалі курсавыя, дыпломныя работы. У камандзе нічога не рабілася. Між іншым, замежныя калегі правялі грунтоўныя даследаванні, якія сведчаць, што найбольшы эфект для прафесійнага развіцця мае ўзаемнае навучанне. А нашы настаўнікі баяцца і не жадаюць дзяліцца сакрэтамі сваёй «кухні», не запрашаюць да сябе на ўрок. Мы прывучаліся паказваць на адкрытым уроку бездакорную карцінку, але, каб адбываўся працэс узаемнага навучання педагогаў, трэба запрашаць калег да сябе, калі штосьці ў вас не атрымліваецца.

Мікалай Запрудскі ўпэўнены, што беларускай школе трэба прымяняць такія тэхналогіі, якія забяспечваюць якасць адукацыі ў адпаведнасці з выклікамі часу. Адзін з такіх трэндаў — перакуленае, або змешанае навучанне. На думку экспертаў ЮНЕСКА, да 2025 года ўжо 60 працэнтаў дзяцей у свеце будуць навучацца па мадэлі перакуленага ўроку, калі ўся тэарэтычная і лекцыйная праграма вывучаецца дома, а ў класе з настаўнікам падрабязна разбіраюцца заданні і практыкаванні па тэме. Гэта значыць, лекцыі — дома, а «дамашка» — у класе.

Пры традыцыйным навучанні настаўнік перадае гатовыя веды, а вучні выступаюць больш пасіўнымі слухачамі, пры перакуленым — лідарская пазіцыя на ўроку належыць не педагогу, а дзецям. У навучэнцаў ёсць шырокія магчымасці для пошуку ісціны, выказвання сваіх меркаванняў і ідэй. Вучням дэлегуецца адказнасць за адукацыйныя вынікі, ствараюцца ўмовы для іх самарэалізацыі. Урок ператвараецца з месца, дзе даюць веды, у месца, дзе веды выкарыстоўваюцца для іх замацавання і паглыблення.

Ёсць меркаванне, што школьная адукацыя ў будучыні зведае значныя змены: са школы знікнуць адзнакі, заўвагі ў дзённіках і выклікі бацькоў. А ў якасці альтэрнатывы ацэньвання застанецца толькі фіксацыя прагрэсу паспяховасці вучняў.

«Урокі могуць быць без адзнак у балах, — упэўнена кажа Мікалай Запрудскі, — але ацэнка работы вучня абавязкова павінна прысутнічаць, прычым не толькі з боку педагога, але і з боку аднакласнікаў. Пакуль што мы «танцуем» вакол адзнак: высокіх, сярэдніх і нізкіх. Вось толькі ці можа нізкі бал матываваць дзіця да навучання?»

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вернісаж

# ЖЫЦЦЁ НАСУПЕРАК І ПРАЗ ПРЫЗМУ ВЕЧНАГА

**Міжнародны фестываль мастацтва «Арт-Мінск» стартаваў днямі ў сталіцы. Сёлета ўдзел у ім прымаюць творцы як з Беларусі, так і з Эстоніі і Славакіі. Убачыць маштабную экспазіцыю фэсту з работамі каля 400 беларускіх мастакоў можна на розных пляцоўках горада. Увазе наведвальнікаў таксама прадстаўлены работы І трыенале жывапісу, графікі і скульптуры Беларускага саюза мастакоў «VIVAT VITA», а таксама выставачны праект «Графіка года».**

— Сёння мы больш гаворым пра хваробы, пра тое, што адбываецца з людзьмі, але абмінаем увагай іншыя, не менш важныя, рэчы. Наш арт-фестываль — гэта вялікая падзея ў краіне, хоць у гэтым годзе яна і своеасаблівая. У адным фэсце аб'ядналіся тры вялікія праекты, якія наведвальнікі змогуць убачыць на працягу месяца да 16 снежня, — адзначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Вядома, мы не змаглі б змясціць усе работы нашых мастакоў, якіх сёлета каля 400, таму пляцоўкі фестывалю з'явяцца не толькі ў Палацы мастацтваў, але і ў Нацыянальнай бібліятэцы, і ў галерэі «Мастацтва», у галерэі «Беларт» і іншых месцах. Напрыклад, у «Беларце» пакажам пейзаж у работах мастакоў розных пакаленняў, а ў галерэі «Мастацтва» ладзім выстаўку, прысвечаную творчасці Сяргея Цімохава, якому сёлета споўнілася б 60 гадоў... Таксама нам вельмі хочацца, каб не засталіся ўбаку мастацтвазнаўцы, бо важна не толькі паказаць мастацтва, але і гаварыць пра яго. Мяркую, пачынаючы з гэтага фестывалю заснуём традыцыю абмяркоўваць нашы мерапрыемствы і праекты. І спадзяюся, што дыскусія атрымаецца вострая, бо ёсць пра што спрачацца.

Так, у мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва мінчане могуць пазнаёміцца з творчасцю Івана Міско, Васіля Шаранговіча, Льва Гумілеўскага, Уладзіміра Тоўсціка і самога Леаніда Шчамялёва. Выстаўка станковай скульптуры і малюнкаў Анатоля Арцімовіча «XXI стагоддзе» чакае сваіх наведвальнікаў у выставачнай зале імя Андрэя Бембеля. Экспазіцыя графікі Сяргея Цімохава «Край святла» адкрылася ў галерэі «Мастацтва». Праект «Сібірская гарачка» ад мастакоў са Славакіі чакае ў галерэі «Арт-Беларусь». У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з творчасцю эстонскіх мастакоў. А з 24 лістапада тут можна наведаць літаратурна-мастацкі праект «Княства вобразаў і сноў», прысвечаны 90-годдзю Уладзіміра Караткевіча. Гэты сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і Саюза мастакоў Беларусі дае магчымасць як згадаць творчасць класіка, так і пазнаёміцца з работамі графікаў, што малявалі, натхняючыся творамі пісьменніка.


Фота БелТА.

«Тыя работы, якія з'яўляліся ў кнігах, павінны ўспрымацца не проста як ілюстрацыя, яны існуюць яшчэ і як самадастатковыя творы. Мы зрабілі своеасаблівы зрэз таго, як глядзелі на творы Караткевіча мастакі розных пакаленняў і светапогляду. На гэтай выстаўцы будуць унікальныя рэчы, напрыклад, малюнкі Арлена Кашкурэвіча, якія ён зрабіў яшчэ пры жыцці пісьменніка. Будуць работы Віктара Мікіты па матывах твораў класіка», — распавядае Наталля Шаранговіч.

Арганізатары адзначаюць, што імкнуліся кожны праект падрыхтаваць так, каб гэта было цікава аўдыторыі. З самага пачатку задумваліся і над арганізацыяй навучальных мерапрыемстваў. Зразумела, зараз складана сабраць людзей, але ўсё ж такі ў межах І трыенале распачнецца праект мастацтвазнаўца Тацяны Бембель. Яна прапанавала цыкл лекцый, прысвечаных найлепшым скульптарам, знакавым постацям XX стагоддзя. Першая лекцыя, якая распавядзе пра Міхаіла Керзіна, адбудзецца ў снежні ў Выставачнай зале імя Андрэя Бембеля. Гэта пачатак вялікай праграмы, якая расцягнецца на паўгода. Калі характарызаваць работы сёлетняга фестывалю з пазіцыі тэм і сэнсаў, варта адзначыць, што стала менш пейзажаў, а павялічылася колькасць тэматычных работ, дзе знаходзяць адлюстраванне ўзаемаадносіны паміж людзьмі, а таксама філасофска-сацыяльная праблематыка.

— Хачу спыніцца крыху на праекце І трыенале, які мы назвалі «VIVAT VITA», што ў перакладзе значыць «Вітанне жыццё». На сёння — гэта найбольш актуальны пасыл у няпростых умовах. Час выбраў нас, мастакоў, і мы адказваем на ягоны выклік. Творчасць і мастацтва зараз становяцца яшчэ больш актуальнымі і паказваюць, што жыццё ў любым выпадку пераможа любыя нягоды, праблемы і перафармаціруе нас, дазволіўшы выйсці на новы ўзровень, — кажа **намеснік старшыні па творчых і агульных пытаннях Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Другі праект «Графіка года» праходзіць у нас ужо чацвёрты раз. Прыемна, што мастакі эксперыментуюць, і да графікі, напрыклад, звярнуліся і жывапісцы, скульптары.

Варта адзначыць, што ў канцы фестывалю журы, у склад якога ўваходзяць мастацтвазнаўцы, вызначыць пераможцаў сярод удзельнікаў трыенале і праекта «Графіка года» ў такіх намінацыях, як «Жывапіс», «Графіка», «Скульптура», і асобна ў намінацыях «Графіка года» і Гран-пры. Убачыць творы і наведаць мерапрыемствы фестывалю можна кожны дзень да 16 снежня. Сачыце за раскладам у сацыяльных сетках фэсту.

**Алена ДРАПКО.**

Кінакрокі

# Фестывальная вандроўка класіка

**Прэм'ерны паказ нацыянальнага кінапраекта «Янка Купала» рэжысёра Уладзіміра Янкоўскага прайшоў нядаўна на II Міжнародным фестывалі кіно краін Садружнасці «Маскоўская прэм'ера». Фільм, які яшчэ да свайго выхаду на экраны зрабіўся легендай для беларускай публікі, выхаду якога напружана чакалі некалькі гадоў, быў не толькі цёпла сустрэты, але і адзначаны ўзнагародай.**

Згаданы намі фестываль праходзіць кожны год. Ён аб'ядноўвае кінематаграфістаў і гледачоў з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана, Украіны і Эстоніі. Мерапрыемства арганізоўваецца пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД.

— На фестывалі я быў у складзе журы, але наш фільм не ўдзельнічаў у праграме. Яго проста прадставілі як падзею фестывалю, і мы зрабілі прэм'еру ў Доме кіно. Потым атрымалі спецыяльны прыз «Падзея кінематаграфічнага года» на тэрыторыі краін СНД, — распавядае **рэжысёр фільма Уладзімір ЯНКОЎСКІ.** — У зале на тысячу месцаў з-за эпідэміялагічнай сітуацыі на паказ трапіла толькі чвэрць жадаючых, але ўсё роўна для мяне гэта было ярка і запамінальна. Пасля прагляду ў зале 15 хвілін не сціхалі авацыі, некаторыя нават плакалі. Да мяне падыходзілі расійскія кінакрытыкі са станоўчымі водгукамі. А беларусы з маскоўскай дыяспары




казалі, што для іх гэта сапраўдны падарунак. Для мяне самога гэты фільм на дадзеным этапе маёй творчасці — самы галоўны праект у жыцці. Безумоўна, я шчаслівы, што ён падабаецца людзям, закранае іх пачуцці і нікога не пакідае абыякавым.

Гістарычная драма апавядае пра лёс народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Яго асоба — гэта сімвал беларускай нацыянальнай самасвядомасці. У карціне раскрываюцца асноўныя вехі жыццёвага і творчага шляху паэта, які супаў з найбольш трагічнымі падзеямі XX стагоддзя. Кінастужка апавядае пра любоў і нянавісць, жыццё і смерць, творчы і літаратурны дар чалавека, якому ўдалося зрабіць значны ўнёсак у культуру нашай краіны ўсяго за некалькі дзесяцігоддзяў. Фільм, хранаметраж якога складае 156 хвілін, здымалі ў Беларусі, Расіі і Літве. Галоўную ролю ў ім сыграў латышскі акцёр з беларускімі каранямі Мікалай Шастак. Яго абралі ў тым ліку і з прычыны вялікага вонкавага падабенства акцёра з паэтам у маладосці. А вось у ролі Паўліны Мядзёлкі, каханай жанчыны класіка, знялася беларуская актрыса Вераніка Пляшкевіч.

— Фільм у Маскве прынялі добра, прыемна, што да яго паставіліся як да цікавага кінатвора, адзначыўшы высокі прафесійны ўзровень стваральнікаў. Таму я задаволены, што мы яго паказалі, нягледзячы на пандэмію і ўсе астатнія абставіны. Бо ў нас, на жаль, не змаглі адбыцца прэм'еры гэтай кінастужкі на іншых, больш буйных фестывалях, але мы будзем працягваць арганізоўваць яе паказы на такіх пляцоўках. І старт гэтаму працэсу дадзены, — дзеліцца **генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ.** — Добрую якасць фільма адзначылі кіназнаўцы, і публіка цёпла яго сустрэла. Таму, мяркую, у нас усё атрымалася. «Купала» — гэта ўдалая спроба расказаць пра беларускага класіка. Да таго ж паказ адбыўся ў легендарным месцы — у Доме кіно, дзе ў свой час праходзілі прэм'еры многіх класікаў кінематографа савецкіх часоў. Плюс там добрае абсталяванне, што дазволіла прадэманстраваць фільм на належным узроўні, якасна. Мы пачалі наша фестывальнае вандраванне і, безумоўна, маем жаданне, каб «Купалу» паказалі і на іншых кінафестывалях, таму працягнем работу ў гэтым кірунку. Накont таго, калі варта чакаць карціну ў пракаце, — думаю, гэта стане ясна пасля заканчэння пандэміі. Мы ўсе бачым, што адбываецца — гледачы не наведваюць залы тэатраў і кінатэатраў, таму будзем чакаць больш спрыяльных умоў.



А пакуль што кінааматары маюць магчымасць азнаёміцца з трэйлерам фільма, які ёсць на беларускай, рускай, англійскай і кітайскай мовах. А пасля таго як дачакаемся з'яўлення кінастужкі ў афішах кінатэатраў, з часам можна будзе ўбачыць і яго 4-серыйную тэлеверсію. На «Беларусьфільме» адзначылі, што яна ўжо гатовая і чакае ўдалага моманту. Гэты варыянт кінатвора складаецца з чатырох серый па 52 хвіліны і дазволіць гледачам убачыць некаторыя з тых эпізодаў, якія не ўвайшлі ў версію для вялікіх экранаў. Напрыклад, калі перыяд дзяцінства паэта ў фільме паказаны толькі часткова, то ў тэлеварыянце ён займае асобную серыю. Калі згадаць гісторыю са спробай заўчаснага «зліву» чарнавога варыянта фільма ў сеціва, якая ў свой час атрымала пэўную палагоску, то зразумела, што публіка даўно чакае выхаду «Купалы» на экраны, але, на жаль, пандэмія змяняе ўсё на свой лад. Каб атрымаць поўнае ўяўленне пра маштаб таго, што мусілі сказаць пра народнага паэта стваральнікі кінастужкі, варта паглядзець абодва варыянты і толькі пасля рабіць канчатковыя высновы.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота дадзена кінастудыяй «Беларусьфільм».**

Вецер вандраванняў

# ЗАГАДКАВАЯ ЧАЧНЯ

## Як сярэднявечныя традыцыі спалучаюцца з сучаснасцю

**«Наша пакаленне — дзеці вайны. У нас не засталося вуліцы, па якой мы ішлі ў першы клас, няма двара таго дома, дзе прайшло дзяцінства. У нас няма сяброў той пары, бо добрая палова майго класа загінула ў бамбасховішчы ў 1995 годзе, калі бамбілі Грозны. Але я не азлобленая на ўвесь свет, бо ведаю, што з тымі, хто вінаваты ў гэтай вайне, я ніколі не сустрэнуся», — кажа этнічная чачэнка Дагмара ІСАКАВА. Як жывуць у Чачэнскай Рэспубліцы сёння, ці лёгка прыйшлося беларусу, які пераехаў сюды 11 гадоў таму, і чаму вучаць даўнія традыцыі гэтага народа, мы паназіралі падчас прэс-тура, арганізаванага Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы і МІА «Россия сегодня».**



Дагмара ІСАКАВА.

### ПАКАЛЕННЕ ВАЙНЫ

— Маё дзяцінства прайшло на руінах майго роднага дома. Па сутнасці, дзяцінства ў мяне, як і ў маіх равеснікаў, не было. Мы — дзеці вайны, — расказвае Дагмара.

Яе бацька ўдзельнічаў у баявых дзеяннях, і сям'я перажыла ўсе жахі вайны і ў першую, і ў другую чачэнскія кампаніі. А потым і абмежаванні падчас рэжыму так званай контртэрарыстычнай аперацыі, а аднаўленне больш чым на 90 % разбуранага Грознага адбывалася на іх вачах.

**«Самы высокі — 145-метровы жылы комплекс, а гэта 45 паверхаў. Будынкі могуць вытрымаць сейсмахвалі звыш дзевяці балаў».**

— Людзям выдаваліся кампенсацыйныя выплаты за страчанае жыллё і маёмасць. Паступова аднаўляліся шматкватэрныя жылыя дамы, і людзі па сваіх дакументах засяляліся назад. Былі пункты часовага размяшчэння, дзе забяспечвалася харчаванне, пражыванне, пакуль не было свайго жылля. Добра дапамагаў стары звычай чачэнцаў, калі ўсе талакой — сябры, суседзі, сваякі — збіраюцца ў пэўны дзень і прыходзяць дапамагаць: рабіць дах, класці цэглу. Так з двара ў двор людзі хадзілі і адно аднаму дапамагалі. Бо калі б яшчэ і за рабочую сілу даводзілася плаціць, расходы былі б каласальныя. І так дом за домам аднаўлялі.

Я выдатна памятаю, як пачалі аднаўляць Грозны. Мае бацькі гэтаму былі вельмі рады, бо гэта горад іх дзяцінства і юнацтва. 24 гадзіны сем дзён на тыдзень працавала тэхніка, гарэлі лямпы. Брыгады проста змянялі адна адну, але работы не спыняліся ні на хвіліну. Пасля заканчэння рабочага дня ўвесь кабінет міністраў, кіраўніцтва рэспублікі далучалася да грамадскіх работ. Кожную суботу праводзіліся суботнікі: вычышчалі, вымывалі, каб у горадзе не было адчування захламленасці і разбуранасці, каб было бачна, што тут ёсць гаспадары. І так участак за ўчасткам горад набываў сучасныя абрысы. І Грозны, якому спецыялісты прарочылі ад 15 да 50 гадоў аднаўлення, быў адбудаваны за шэсць гадоў.

Дагмара ў гэты час вучылася ва ўніверсітэце, на факультэце турызму і гасцінасці. У рэспубліцы тады дзейнічаў рэжым контртэрарыстычнай аперацыі.

— У нас паўсюль былі блокпасты, бясконцыя агляды, абмежаванні, і я прыязджала ў Грозны, каб атрымаць веды ва ўмовах разбуранага горада. На чацвёртым курсе, за два месяцы да трагічнай гібелі нашага першага прэзідэнта Ахмата Кадырава мне давялося пабываць на сустрэчы з ім. Я спытала: наколькі патрэбна мая спецыяльнасць? Ён мяне выслухаў, усміхнуўся і сказаў: «Я вам абяцаю, што праз дзесяць гадоў нашу рэспубліку будуць наведваць натоўпы гасцей і з'язджаць ад нас з жаданнем вярнуцца зноў. Вучыцеся, бо вам гэта спатрэбіцца». І ведаеце, я ні на секунду не пашкадавала, — прызнаецца суразмоўніца.

Дагмара кажа, што вучылася на «тройкі», але пасля сустрэчы з кіраўніком рэспублікі пераздала ўсе свае экзамены, і скончыла ўніверсітэт з «чырвоным» дыпломам. Сёння яна працуе куратарам турысцкай і экскурсійнай дзейнасці ў Чачэнскай Рэспубліцы. І пацвярджае, наколькі спраўдзіўся прагноз тагачаснага лідара. Па звестках Міністэрства турызму Чачэнскай Рэспублікі, у 2019 годзе рэгіён наведала больш за 220 тысяч гасцей, каля паловы з іх вяртаюцца зноў.

Дарэчы, жанчына адзначае характэрную рысу Ахмата Кадырава і яго атачэння, якую заўважыла праз тую сустрэчу, — адказнасць за свае словы. Абяцанне першага прэзідэнта рэспублікі было выканана нават пасля яго смерці.

— Мы тады абмяркоўвалі, як было б цудоўна, калі б у Чачні запрацаваў сотавы апаратар. І разважалі: «Вось уявіце: прыязджаеш на вучобу, тут жа тэлефануеш маме і кажаш: я прыехаў, усё ў парадку. Як гэта здорава». Хоць мы ў вочы не бачылі, як выглядае сотавы тэлефон. Ахмат Кадыраў тады сказаў: «Я вам абяцаю, у пачатку наступнага навучальнага года яны ў вас будуць». У сакавіку адбывалася гэта сустрэча, у маі Ахмата Кадырава не стала (9 мая 2004 года на стадыёне «Дынама» ў Грозным падчас канцэрту ў гонар дня Перамогі на цэнтральнай трыбуне, дзе знаходзіўся кіраўнік рэспублікі, спрацавала ўзрыўное прыстасаванне. — **«Зв».**). А ў жніўні таго ж года ў мае дзверы пагрукаліся прадстаўнікі адміністрацыі, папрасілі прад'явіць студэнцкі білет, зверылі маё прозвішча са спісамі тых, хто быў на сустрэчы, — і падарылі мне сім-карту і мой першы сотавы тэлефон. Каб вы бачылі, наколькі я была здзіўлена! Я зразумела, што ўсе мае намаганні не дарэмныя. І калі б не той момант, я б пайшла ў жыцці іншай дарогай, і мы б з вамі не сустрэліся сёння.

Сёння Дагмара працуе з турыстамі з розных краін і рэгіёнаў. У Чачэнскую Рэспубліку прыязджаюць з Заходняй Еўропы і Амерыкі, краін Блізкага Усходу, але найбольш гасцей усё ж з розных куткоў Расіі.

— На майскія святы прыязджала вельмі пазітыўная група з Беларусі, студэнты геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, я іх добра запомніла. Гэта была вельмі шумная кампанія ў добрым сэнсе — на нас на вуліцах азіраліся ўсе мінакі. Нам трапілася квітнеючае дрэва, і яны, па традыцыі, завязвалі стужкі і загадвалі жаданні. Адна дзяўчына не хавала, што загадала, каб праз нейкі час мы сустрэліся тут жа, але іншым складам, бо яна хацела прыехаць з аднакурснікамі.

### ГОРАД-ФЕНІКС, АБО НЯГРОЗНЫ ГРОЗНЫ

Дагмара расказвае, што самі чачэнцы няшмат падарожнічаюць. Відавочна, што дваццаць гадоў таму, калі вяліся баявыя дзеянні, было не да таго. Апошнія 15 гадоў людзі стараліся аднавіць жыллё. «Чачэнец нараджаецца вольным, а памірае будаўніком», — усміхаецца суразмоўніца. Грошы ў сям'і збіраюць цэлы год, і на іх летам трэба абавязкова штосьці пабудаваць, прыбудаваць ці перабудаваць. А вось збіраць грошы на адпачынак не прынята. Праўда, цяпер, калі сталі стварацца ўмовы ўнутры рэспублікі, мясцовыя жыхары сапраўды сталі больш ездзіць.

— Пасля дзвюх ваенных кампаній у тое, што рэспубліка аднаўляецца і мір уваходзіць у нашы дамы, людзі верылі неахвотна. На жаль, усе пабачылі многае, ні адну сям'ю не абышла другая ваенная кампанія. Паверыць у тое, што доўгачаканы мір наступіць, калісьці было вельмі складана, — кажа Дагмара.

І сімвалам гэтага міру стаў Грозны. Яго называюць горадам-Феніксам. Страціўшы амаль усе свае будынкі і 250 тысяч жыхароў, ён літаральна паўстаў з попелу. Аднаўляць горад давялося ўжо Рамзану Кадыраву. Дарэчы, яго партрэты, а таксама Ахмата-Хаджы Кадырава і Уладзіміра Пуціна вісяць на фасадах многіх будынкаў — такі своеасаблівы ўсходні каларыт. За два гады, з 2006-га да 2008-га, тут была пабудавана адна з самых вялікіх мячэцяў у Еўропе — «Сэрца Чачні». Яшчэ адным сімвалам адраджэння рэспублікі стаў Грозны-Сіці. Вышынны комплекс будавала турэцкая кампанія ў 2007—2011 гадах. Гэта сем будынкаў — адміністрацыйныя і жылыя. Самы высокі — 145-метровы жылы комплекс, а гэта 45 паверхаў. Будынкі могуць вытрымаць сейсмахвалі звыш дзевяці балаў. Дарэчы, пра землятрус у 4,5 бала, што адбыўся тут тры гады таму, жыхары даведаліся толькі са званкоў сваіх сяброў, бо самі гэтага нават не адчулі. Але няма мяжы для новых вышынь. 435-метровая вежа «Ахмат-таўэр» будуецца насупраць, а гэта, між іншым, 102 паверхі.

**«На жаль, усе пабачылі многае, ні адну сям'ю не абышла другая ваенная кампанія. Паверыць у тое, што доўгачаканы мір наступіць, калісьці было вельмі складана».**

Апартаменты, дарэчы, у Грозным-Сіці каштуюць чатыры-пяць мільёнаў расійскіх рублёў (52—65 тысяч долараў). Аднапакаёвую кватэру ў чачэнскай сталіцы можна набыць за 800 тысяч — 1 мільён расійскіх рублёў (ад 10 тысяч долараў). Адзін з цэнтральных праспектаў у Грозным носіць імя Уладзіміра Пуціна. Мясцовыя жыхары называюць такі жэст малой часткай той падзякі, якую народ рэспублікі можа выказаць расійскаму прэзідэнту за федэральную падтрымку ў аднаўленні рэспублікі.

### ЯК ЖЫВЕЦЦА Ў ЧАЧНІ БЕЛАРУСУ?

Беларус Віктар Бортнікаў называе сябе сваім сярод чужых і чужым сярод сваіх. Адзінаццаць гадоў таму ён прыехаў у Чачэнскую Рэспубліку працаваць на мясцовым тэлебачанні.

— Я беларус, з горада Наваполацка. Маю некалькі адукацый — мастацтвазнаўчую, рэжысёрскую, драматургічную. Усе іх атрымаў у Мінску, — расказвае мужчына. — Адзінаццаць гадоў таму чачэнская тэлерадыёкампанія на тэлеканале НТБ аб'явіла конкурс, патрабаваліся карэспандэнты. Я даслаў свае праграмы, і мяне запрасілі ў Грозны.

Віктар прызнаецца, што трапіў у Чачню ў няпросты перыяд. Мясцовыя жыхары ставіліся да яго па-рознаму, і нярэдка — з насцярожанасцю.

— Было ўсялякае, але выжыў. Ніхто не стрэліў услед, не падарваўся на мінах, якіх шмат было ў гарах, і я пра гэта здымаў праграмы. Калі заходзіў туды, дзе былі расцяжкі, то шукаў мядзведжыя сляды і паспяхова адтуль сыходзіў, бо жывёлы першымі размініруюць такія месцы.



Беларус Віктар БОРТНІКАЎ жыве ў Чачні адзінаццаць гадоў.

Ведаеце, справа не ў розніцы культур і веравызнанняў, важна, які ты чалавек, твае чалавечыя якасці. Калі да іншых ставіцца з дабром і павагай, ніякіх праблем не будзе.

На ЧДТРК «Грозны» Віктар робіць аўтарскую праграму «Крыніцы жыцця» — пра прыроду, жывёльны свет, гісторыю. У ролі карэспандэнта і аператара беларус выступае ў адной асобе — падняцца высока ў горы з камерай пад сілу далёка не кожнаму.

— Я паднімаюся высока ў горы, здымаю тураў, безааравых коз, мядзведзяў, побач з імі хаджу. Таксама знімаю гістарычныя перадачы пра вежы, этнічныя праграмы. Я ўсё раблю адзін.

За адзінаццаць гадоў Віктар Бортнікаў пабываў на ўсіх гарах, пажыў (ці хоць бы начаваў) ва ўсіх сёлах, добра вывучыў мясцовыя быт і культуру. Чачэнскай мовай, праўда, не авалодаў. Прызнаецца, што ў гэтым няма патрэбы, бо героі яго перадач — 90—100-гадовыя доўгажыхары мясцовых паселішчаў добра размаўляюць па-руску.

— Я і цяпер паднімаюся ў горы, здымаю, як людзі косяць сена, сушаць мяса на зіму. Мядзведзі восенню блізка падыходзяць да сёлаў, бо перад зімой ім трэба есці мяса. І ў той сям'і, дзе я жыву, мядзведзі зарэзалі чатырох бычкоў.

Жыве беларус у гарах, у высакагорным сяле Дай — здымае пакой у сям'і галоўнага паляўнічтвазнаўца Шаройскага раёна. Як і ў многіх чачэнскіх сем'ях, там шмат дзяцей — сямёра, з імі жыве і жонка брата — удава з трыма дзецьмі. З усімі беларусу ўдалося паладзіць.

— Перыядычна я наведваю Беларусь. Раблю праграмы на два-тры месяцы наперад, і еду дадому дапамагаць маці. У мяне на радзіме вялікі агарод, яблыневы і грушавы сад. Што цягне вяртацца ў Чачню? Горы! Чым вышэй у гарах, тым бліжэй да Бога. Ведаеце, радзіма заўсёды застаецца ў душы. Але свет вялікі і цудоўны, яго трэба зведваць, і гэта сапраўднае шчасце.

### У ЧЫМ САКРЭТ МОЦНЫХ ШЛЮБАЎ?

Дарэчы, традыцыі чачэнскага народа і іх адносіны да сям'і многія хацелі б пераняць. Тут не прынята скасоўваць шлюб, і гэта адбываецца вельмі рэдка. Мужчына, які нясе адказнасць за сям'ю, не можа сказаць, што яны з жонкай не сышліся характарамі, бо сваякі яго не зразумеюць і не дазволяць гэтага. Шлюбы тут пераважна рэлігійныя, а ў загс маладая сям'я звычайна ўпершыню прыходзіць, калі ўжо трэба афармляць дакументы на дзіця. Але вяселлі адбываюцца вялікія і шумныя, куды запрашаюць да 300—400 гасцей.

Права на слоўнае скасаванне шлюбу мае толькі мужчына. Для гэтага яму варта тройчы пра гэта паведаміць жонцы. Пасля гэтага жыць разам яны не могуць. У жанчыны такога права няма, бо лічыцца, што яны больш эмацыянальныя і схільныя да нерацыянальных учынкаў. Пры гэтым калі жанчына жадае скасаваць шлюб, яна можа звярнуцца да імама ў найбліжэйшую мячэць. Імам разбіраецца, і калі правы жанчыны сапраўды ўшчамляюцца, ён дае развод.

Дзяцей у сем'ях выхоўваюць строга, прычым займаецца гэтым жанчына. Для дачкі ці сына маці — найлепшая сяброўка. З ёй абмяркоўваюць тое, што не кажуць іншым, нават асабістае жыццё. Калі ў сям'і некалькі сыноў, малодшы заўсёды застаецца ў доме бацькоў, нават калі заводзіць сваю сям'ю. Тут амаль ніколі бацькі сталага веку не жывуць асобна.

У 95 % выпадкаў чачэнкі не працуюць, а займаюцца гаспадаркай, а мужчына забяспечвае сям'ю. Калі ж мужчына не спраўляецца, жанчына мае права выйсці на работу. Праўда, сёння ўсё часцей жанчыны парушаюць устоі — у Грозным яны працуюць паўсюль, нават кіруюць таксі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» (г. Гродно, пер. Виленский, д. 16, ул. Фолюш, д. 15/336)

## 22 декабря 2020 года

| Вид аукциона (открытый) | Лот № 1 | Лот № 2* |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 8 капитальных строений (здание административное, здание склада, здание гаража – 2 шт., здание проходной – 2 шт., здание склада готовой продукции), 4 передаточных устройства (участок тепловой сети, участок водопроводной сети, участок канализационной сети, элементы благоустройства), зеленые насаждения, 10 единиц оборудования | Капитальные строения с инвентарным номером 400/С-21060 – здание нежилое (химчистка, баня, мастерская) площадью 425,0 кв. м, 400/С-21057 – здание неустановленного назначения (прачечная) площадью 2436,5 кв. м, 400/С-21056 – здание специализированное автомобильного транспорта (гаражи) площадью 329,8 кв. м, 400/С-21059 – здание нежилое (КПП) площадью 10,5 кв. м, стационарный водогрейный котел КСТБ-95 |
| **Начальная цена продажи** | **1 800 000,00 рубля** (с учетом НДС 20 %) | **1 479 177,60 рубля** (с учетом НДС 20 %) |
| **Кадастровые номера земельных участков и их размеры** | 440100000002001136 площадью 0,7335 га | 440100000001011170, 0,7281 га; 440100000001001400, 1,1153 га |
| **Месторасположение земельного участка** | **Гродненская область, г. Гродно, пер. Виленский, д. 16** | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Фолюш, д. 15/336** |
| **Продавец** | Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 607300 | |
| **Имущественное право земельных участков** | Право постоянного пользования | Право аренды (61/100 доли); право постоянного пользования |
| **Сумма задатка** | **54 000,00 рубля** | **44 375,00 рубля** |

Организатор аукциона: **коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010**

Дата проведения аукциона: **22 декабря 2020 года.** Время проведения аукциона: **12.00**

Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**

Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет 407**

Дата и время начала приема документов: **23 ноября 2020 года 8.00**

Дата и время окончания приема документов: **16 декабря 2020 года 17.00**

** – В соответствии с градостроительным проектом общего планирования «Генеральный план г. Гродно (объект 2.17-00) данные здания расположены в ландшафтно-рекреационной зоне и могут быть реконструированы под объекты общественного назначения.*

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Возможные условия расчетов по договору купли-продажи недвижимости:

100 % предоплата в течение 14 календарных дней со дня заключения договора, передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты полной оплаты стоимости недвижимого имущества;

50 % предоплата в течение 14 календарных дней со дня заключения договора, передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты внесения предоплаты; оставшаяся часть стоимости имущества уплачивается равными долями в течение 12 месяцев с даты заключения договора купли-продажи, с возможностью досрочного погашения;

равными долями в течение 12 месяцев с даты заключения договора купли-продажи, с возможностью досрочного погашения; передача недвижимого имущества в течение 5 рабочих дней с даты полной оплаты стоимости недвижимого имущества.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 20 дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета **http://grodno.gov.by,** организатора аукциона **http://gcn.by**

## Уважаемые акционеры ОАО «Дрожжевой комбинат»!

**30 ноября 2020 года в 11.00**

**проводится внеочередное собрание акционеров общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14, актовый зал.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. «О безвозмездной передаче унитарного предприятия «Ошмянский дрожжевой завод» в собственность Республики Беларусь».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания при предъявлении акционерами (их представителями) документов, подтверждающих их полномочия (акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном законодательством порядке).

Время начала регистрации: 10 часов 20 минут. Время окончания регистрации: 10 часов 50 минут.

Датой формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в собрании, определить 20.11.2020.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 20 ноября 2020 года по 30 ноября 2020 года с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14 (отдел правовой и кадровой работы), а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

УНП 100104781

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** ***(организатор аукциона)*** **по поручению ОАО «Солигорскторг»** ***(продавец)*** **проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ХОЛОДИЛЬНИКА РАСПРЕДЕЛИТЕЛЬНОГО

***(составные части и принадлежности: машинное отделение, бытовое помещение)*** **с инв. № 644/С-2071 общей площадью 1 487,1 кв. м**

## И ЩИТА УЧЕТА ЭЛЕКТРОЭНЕРГИИ С ДВУМЯ СЧЕТЧИКАМИ

**(инв. № тб-101), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625000000012002781 площадью 0,4471 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий – 1, участок № 4 (далее – Объекты).**

**Часть капитального строения обременена договорами аренды (сведения можно получить у организатора аукциона).**

Начальная цена с НДС (20 %) – **122 026,80** бел. руб. *Начальная цена снижена на 30 %*. Задаток 10 % от начальной цены – **12 202,68** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата Объектов производится в следующем порядке:

- 30 (тридцати) процентов стоимости имущества в течение 20 (двадцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи с возможной рассрочкой оплаты оставшихся 70 (семидесяти) процентов в течение 6 (шести) календарных месяцев с внесением платежей равными долями (по 11,6 %), с учетом ежемесячной индексации цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь, если иное не установлено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона (Объектов). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 14.07.2020, 26.09.2020, 03.11.2020. Аукцион состоится **08.12.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.12.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.**

УНН 600122715

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 24.12.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Единый объект недвижимого имущества: капитальное строение с инвентарным номером 333/С-74742 общей площадью 146,5 кв. м (назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: столовая), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 322356000001000570 площадью 0,1938 га (право постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. п. Озаричи, ул. Бобруйская, 28. **Начальная цена продажи – 26 244,00 бел. рубля, задаток – 2 624,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Единый объект недвижимого имущества: капитальное строение с инвентарным номером 332/С-121165 общей площадью 365,6 кв. м (назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: здание столовой), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321650100002000830 площадью 0,1167 га (право постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Хвойная, 17. **Начальная цена продажи – 69 595,20 бел. рубля, задаток – 6 959,52 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-14015 общей площадью 700,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Козлова, 16а/1. Назначение: здание специализированное транспорта, наименование: здание ремонтной мастерской. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340800000001000099 площадью 0,6473 га. **Начальная цена продажи – 123 444,00 бел. рубля, задаток – 12 344,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7109472 общей площадью 17,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35а-722. Назначение: административное помещение, наименование: административное помещение 722. **Начальная цена продажи – 43 254,00 бел. рубля, задаток – 4 325,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5**. Капитальное строение с инвентарным номером 431/С-517 общей площадью 55,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, Малюшичский с/с, д.Скорово, 11. Назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: одноэтажный деревянный жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 423382509601000001 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 640,80 бел. рубля, задаток – 64,08 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-11046 общей площадью 778,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Буйничский с/с, аг. Буйничи. Назначение: здание административное; наименование: здание административное. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 724486006601000153 площадью 8,9574 га. **Начальная цена продажи – 215 280,00 бел. рубля, задаток – 21 528,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-50962 общей площадью 597,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Могилевский р-н, Буйничский с/с, аг. Буйничи. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание снабжения АБК. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 724486001101000968 площадью 2,2776 га. **Начальная цена продажи – 166 320,00 бел. рубля, задаток – 16 632,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-13416 общей площадью 1 293,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, г. Логойск, ул. Победы, д. 90. Назначение: здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции; наименование: материально-технический склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623250100001001417 площадью 4,4150 га. **Начальная цена продажи – 158 112,00 бел. рубля, задаток – 15 811,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Земельный участок с кадастровым номером 724884000002000056 площадью 0,0997 га, расположенный по адресу: Могилевская обл., Осиповичский р-н, Протасевичский с/с, СТ «Верейцы». Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 008,00 бел. рубля, задаток – 100,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 642/С-27547 общей площадью 47,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Бобовнянский с/с, д. Рымаши, ул. Садовая, 16. Назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622880809601000067 площадью 0,2499 га. **Начальная цена продажи – 2 763,00 бел. рубля, задаток – 276,30 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, садоводческое товарищество «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 2 700,00 бел. рубля, задаток – 270,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Земельный участок с кадастровым номером 321882803601000011 площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, д. Зеленый Кряж, ул. Зеленая, 3. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. **Начальная цена продажи – 1 464,30 бел. рубля, задаток – 146,43 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 410/С-19470 общей площадью 159,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Жолудева, д. 86Б. Назначение: сооружение специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 420850100001009593 площадью 0,0270 га. **Начальная цена продажи – 11 250,00 бел. рубля, задаток – 1 125,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000154 площадью 0,0400 га, расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ Веленский Ветеран. Назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 490,50 бел. рубля, задаток – 49,05 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000155 площадью 0,0396 га, расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, СТ Веленский Ветеран. Назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 481,50 бел. рубля, задаток – 48,15 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-67224 общей площадью 24,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Ковзана Б.И., 84/875. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж 875, ПГСК № 12. Составные части и принадлежности: погреб. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000010000108 площадью 0,8555 га. **Начальная цена продажи – 2 052,00 бел. рубля, задаток – 205,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-27945 общей площадью 1 003,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 11. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонапольные станции); наименование: станция техобслуживания тракторов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000758 площадью 2,1731 га. **Начальная цена продажи – 254 016,00 бел. рубля, задаток – 25 401,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-300 общей площадью 169,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 114. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санитарно-курортных целей; наименование: здание оздоровительного комплекса. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000000500195 площадью 3,4911 га. Составные части и принадлежности: двухэтажное каменное здание оздоровительного комплекса. **Начальная цена продажи – 26 280,00 бел. рубля, задаток – 2 628,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 19.** Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-19414 общей площадью 103,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский район, Солонский с/с, 37В/2. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание сушильной камеры. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321800000001000051 площадью 2,5424 га. **Начальная цена продажи – 13 932,00 бел. рубля, задаток – 1 393,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 20.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-144336 общей площадью 539,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский район, Ждановичский с/с, М-9, 42-ой км, 1. Назначение: здание специализированное для общественного питания; наименование: кафе. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623681700001000643 площадью 0,2181 га. **Начальная цена продажи – 708 480,00 бел. рубля, задаток – 70 848,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 24.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 21.12.2020 в 15.00.**

Задаток перечисляется на р/с BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBNBY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **24 декабря** 2020 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63.**

# ВОГНЕННЫ ТЫГРАЙ

## Што адбываецца ў Эфіопіі?

**Сёлетні лістапад стаў часам трагічных выпрабаванняў для Эфіопіі. Гэтая афрыканская дзяржава апынулася на мяжы грамадзянскай вайны. Супрацьстаянне федэральных ваенных і паўстанцаў рэгіёна Тыграй, якія мараць аб незалежнасці, ужо прывяло да баявых сутычак і вялікай колькасці ахвяр. Як лічаць эксперты, небяспечны канфлікт будзе распальвацца і пагражае дэстабілізаваць абстаноўку не толькі ў рэгіёне Афрыканскага Рога, а і ў еўрапейскіх дзяржавах. Чаму ліхаманіць адну з найбуйнейшых краін Чорнага кантынента?**



### НАДЗВЫЧАЙНАЕ СТАНОВІШЧА

З пачатку лістапада ў Эфіопіі вельмі неспакойна. На мяжы з суседняй Эрытрэяй успыхнулі баявыя дзеянні. Урад Эфіопіі абвясціў аб увядзенні ў рэгіёне Тыграй надзвычайнага становішча тэрмінам на паўгода. Там адключылі мабільную сувязь і інтэрнэт. Прэм'ер-міністр краіны Абій Ахмед заклікаў мабілізаваць войскі пасля таго, як з'явіліся паведамленні аб тым, што паўстанцы з Народнага фронту вызвалення Тыграя (НФВТ), які дабіваецца незалежнасці для рэгіёна, напалі на ваенную базу ўзброеных сіл Эфіопіі, размешчаную ў рэгіёне. Улады заявілі пра тое, што тыя, хто нападаў, «паспрабавалі ўкрасці агнявыя сродкі артылерыі і ваеннае абсталяванне Паўночнага камандавання», паведаміла iz.ru.

У выніку пачалося ваеннае супрацьстаянне. За першыя дні канфлікту загінула больш чым паўтысячы вайскоўцаў, аднак дакладная колькасць ахвяр пакуль невядомая. Паступае супярэчлівая інфармацыя. Урад Эфіопіі сцвярджае, што паўстанцы на працягу месяца здзяйснялі правакацыі і ў рэшце рэшт «перасеклі чырвоную лінію». У сваю чаргу, НФВТ абвінавачвае ўлады ў тым, што яны хацелі «сілай падпарадкаваць насельніцтва



Тыграя». У выніку рэгіянальныя ўлады забаранілі эфіопскім ваенным перамяшчацца па тэрыторыі Тыграя. З'яўляліся паведамленні, што на бок НФВТ ужо перайшло Паўночнае камандаванне эфіопскіх узброеных сіл. Аднак у офісе прэм'ера гэтую інфармацыю абвергліі.

### СВАВОЛЬНЫ РЭГІЁН

Эфіопія — федэратыўная дзяржава, падзеленая на дзесяць правінцый са сваімі парламентамі і прэзідэнтамі. Чатыры найбуйнейшыя народнасці — арома (34 % насельніцтва), амхара (27 %), тыграі і самалі (па 6 %) жывуць у правінцыях, у якіх яны складаюць большасць. Дзясяткі меншых народаў сваіх аўтаномій не маюць, некаторыя з іх за гэтае права змагаюцца. Этнічная разнастайнасць дапаўняецца рэлігійнай. Сярод амхара і тыграі пераважаюць вернікі Эфіопскай праваслаўнай царквы, амаль палова арома і практычна ўсе самалі — мусульмане.

Тыграй знаходзіцца паміж Эфіопіяй і Эрытрэяй. Насельніцтва рэгіёна — больш чым пяць мільёнаў чалавек (а гэта каля шасці працэнтаў 110-мільённага насельніцтва краіны). Тут жывуць прадстаўнікі народнасці тыграі, якая складае большасць насельніцтва суседняй Эрытрэі.

На працягу апошніх 30 гадоў НФВТ уваходзіў у кіруючую кааліцыю «Рэвалюцыйна-дэмакратычны фронт эфіопскіх народаў», аднак год таму сышоў у апазіцыю з-за незадаволенасці палітыкай новага прэм'ера Абія Ахмеда. Звязаныя з НФВТ палітыкі абвінавачвалі кіраўніка эфіопскага ўрада ў тым, што пад выглядам барацьбы з карупцыяй ён імкнецца зачысціць палітычную прастору ад іншадумцаў, да таго ж Абія Ахмед спрабаваў зваліць на рэгіяналаў усе промахі цэнтральнага ўрада.

Народны фронт захаваў поўны кантроль над Тыграем і пачаў кампанію супраць федэральных улад. Адным з галоўных спрэчных пунктаў стала пытанне выбараў. Урад вырашыў перанесці мясцовыя і парламенцкія кампаніі, спаслаўшыся на пандэмію. Першапачаткова яны павінны былі прайсці ў жніўні, аднак пасля іх было вырашана пасунуць на нявызначаны тэрмін. У выніку перанос галасавання падоўжыў паўнамоцтвы Абія Ахмеда, адзначыла iz.ru.

Аднак у Тыграі, нягледзячы на пандэмію, рэгіянальныя выбары ўсё-ткі правялі ў верасні. Федэральныя ўлады вынікі галасавання анулявалі, а новаабранае кіраўніцтва не прызналі. Да таго ж прынялі рашэнне, у адпаведнасці з якім, фінансаваннем гэтага свавольнага рэгіёна цяпер займаецца не ўрад, а мясцовыя адміністрацыі.

Ускладняе напружаную сітуацыю і пытанне кантролю федэральнымі вайскоўцамі за актывамі ў Тыграі. Справа ў тым, што пасля заканчэння вайны паміж Эфіопіяй і Эрытрэяй (за гэта, дарэчы, прэм'ер-міністр Абія Ахмед летась атрымаў Нобелеўскую прэмію міру) у рэгіёне застаецца каля 80 працэнтаў усіх цяжкіх узбраенняў краіны. Федэральныя ўлады апасаюцца ўзмацнення Тыграя, а таксама вялікага ваеннага вопыту мясцовых салдат. У рэгіёне толькі падаграваюць гэтыя трывогі — ладзяць парады і ўсяляк дэманструюць сваю ваенную моц.

У выніку федэральны ўрад яшчэ некалькі месяцаў таму пачаў сцягваць войскі да паўднёвых межаў Тыграя. Афрыканскі саюз, ААН і іншыя арганізацыі выказалі занепакоенасць баявымі дзеяннямі, баючыся, што яны могуць перакінуцца на іншыя часткі Эфіопіі і дэстабілізаваць макрарэгіён.

### БАРАЦЬБА ЗА НІЛ

Канфлікт у Эфіопіі абвастрыўся на фоне аднаўлення перамоў краіны з Егіптам і Суданам па эфіопскай плаціне «Адраджэнне» (гідраэлектрастанцыя «Хідасэ»). Справа ў тым, што Каір і Хартум выступаюць супраць будаўніцтва гэтага аб'екта, яны мяркуюць, што новая плаціна на эфіопскай частцы Ніла пазбавіць іх неабходных водных рэсурсаў, а гэта балюча ўдарыць па эканоміцы.

У эфіопскага ўрада, наадварот, вялікія планы на ГЭС. Цяпер толькі менш чым у паловы насельніцтва ёсць доступ да электраэнергіі. Новая электрастанцыя павінна быць у паўтара раза больш магутная, чым усе, што цяпер працуюць у краіне. У Егіпце і Судане лічаць, што запуск ГЭС і хуткае запаўненне вадасховішча могуць павярнуцца для іх трагедыяй: прывесці да засухі, праблем на Асуанскай ГЭС, а значыць, перабояў у вытворчасці электраэнергіі, страты ўраджаю і рабочых месцаў. Непакоіць Егіпет і тое, што цяпер ён больш не можа аднаасобна распараджацца воднымі рэсурсамі Ніла.

У 1929-м Англія і Егіпет падпісалі дагавор, а праз 30 гадоў пагадненне заключылі Каір і Хартум. Згодна з гэтымі дакументамі, Егіпет атрымаў права накладаць вета на будаўніцтва любых дамбаў і плацін на Ніле. Аднак у Адыс-Абебе лічаць, што Эфіопію гэтая дамова ні да чаго не абавязвае, і дыктаваць краіне ўмовы ніхто не можа. Пасля поўнага запуску «Хідасэ» можа стаць самай магутнай ГЭС у Афрыцы і ўвайсці ў дзясятку найбуйнейшых у свеце. Будаўніцтва гэтай гідраэлектрастанцыі пачалося ў 2011-м, завяршэнне работ намечана на 2023 год.

Трохбаковыя перагаворы доўгі час буксавалі, аднак нядаўна аднавіліся. Пры гэтым на бок Эфіопіі ўстала Эрытрэя, якая першапачаткова падтрымлівала Егіпет. Прэзідэнт Эрытрэі Ісаяса Афеворка падчас візіту ў Эфіопію наведаў плаціну — і хоць ён не зрабіў афіцыйнай заявы аб падтрымцы Адыс-Абебы, эксперты тлумачаць гэты крок менавіта так.

### ШОК ДЛЯ РОГА

Пры гэтым у НФВТ напружаныя адносіны як з федэральнымі ўладамі, так і з Эрытрэяй, адзначыў iz.ru старшы навуковы супрацоўнік



Афрыканскага цэнтра Атлантычнага савета Габрыэль Негату.

— І Адыс-Абеба, і Асмэра варожа ставяцца да НФВТ, хоць і з розных прычын. У сваю чаргу, паўстанцы з Народнага фронту вызвалення Тыграя абвінавачваюць улады Эрытрэі ў тым, што тыя ўсталі на бок Абія, каб звесці з Тыграем старыя рахункі. Пры гэтым няма ніякіх доказаў удзелу Эрытрэі ў гэтай вайне. Страціўшы ўладу ў 2018 годзе, НФВП усяляк імкнецца падарваць намаганні Абія па правядзенні рэформаў. Лічыцца, што менавіта Народны фронт стаіць за большай часткай успышак этнічнага гвалту, ад якіх Эфіопія пакутуе да гэтага часу, — растлумачыў палітолаг.

Пасля таго як абвастрыўся канфлікт паміж уладамі Тыграя і федэральным урадам, па сталіцы Эрытрэі было выпушчана некалькі ракет. Дзве з іх трапілі на тэрыторыю аэрапорта Асмэра. Адзначаецца, што ракеты выпусцілі з тэрыторыі Тыграя. Улады гэтага рэгіёна пагразілі Эрытрэі ўдарамі ў выпадку, калі яна працягне падтрымліваць федэральныя эфіопскія ўлады.

Яго калега, старшы навуковы супрацоўнік Афрыканскага цэнтра Атлантычнага савета Кэмеран Хадсан упэўнены, што напружаная сітуацыя ў Эфіопіі ўяўляе пагрозу для многіх краін у рэгіёне.

— Рашэнне прэм'ер-міністра ўвесці федэральныя войскі ў Тыграй выклікала шок у рэгіёне Афрыканскага Рога і за яго межамі. Эфіопія — другая па велічыні краіна ў Афрыцы, яна мяжуе з шасцю іншымі афрыканскімі дзяржавамі. Ва ўсім рэгіёне пануе нестабільнасць і адзначаюцца вострыя гуманітарныя праблемы. Калі супрацьстаянне ўнутры краіны зацягнецца, то праз мяжу хлынуць сотні тысяч бежанцаў, — лічыць палітолаг.

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш заявіў, што «стабільнасць у Эфіопіі важная для ўсяго рэгіёна Афрыканскага Рога». Вайна ў краіне можа негатыўна паўплываць на іншыя ўсходнеафрыканскія краіны і нават на Еўропу, адзначыў BBC News.

### БЕЗ «ЦУДАЎ»

Узброены канфлікт фактычна сарваў маштабныя пераўтварэнні ў Эфіопіі, якія аналітыкі называлі «эканамічным цудам», заўважыў CNBC. З 2004 да 2019 года краіна мела адзін з самых высокіх тэмпаў эканамічнага росту ў свеце — у сярэднім 11 працэнтаў у год. Аднак цяпер мясцовыя актывы становяцца для інвестараў значна менш прывабныя. Трымальнікі каштоўных папер ужо пазбаўляюцца ад іх і распрадаюць нацыянальную валюту — быр, што прыводзіць да яе аслаблення. Аналітыкі прадказваюць, што ў выпадку эскалацыі канфлікту і перарастання яго ў паўнавартасную грамадзянскую вайну будуць парушаны знешнегандлёвыя сувязі Эфіопіі з асноўнымі партнёрамі.

«Канфлікт выходзіць з-пад кантролю з кожным днём і можа каштаваць дзясяткаў тысяч жыццяў. Нельга цалкам выключаць перспектыву распаду краіны», — заўважыў «Бі-бі-сі» Алекс дэ Ваал, выканаўчы дырэктар World Peace Foundation пры Універсітэце Тафтса ў Бастоне і аўтар некалькіх кніг аб Усходняй Афрыцы. Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў заявіла аб поўнамаштабным гуманітарным крызісе. У суседнім Судане ўжо знаходзяцца больш 30 тысяч тыграйскіх бежанцаў, іх колькасць штодня ўзрастае, паведаміў на брыфінгу ў Жэневе прадстаўнік Упраўлення Бабар Балох. «Людзі прыбываюць з Эфіопіі моцна напалоханыя і расказваюць, што збеглі ад цяжкіх беспрапынных баёў», — дадаў ён. Ніводны з бакоў пакуль не выказвае гатоўнасці да перагавораў.

**Захар БУРАК.**



## Любоў ЧАРКАШЫНА:

# «МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА — ГЭТА ЦЭЛЫ СВЕТ»

**Мастацкая гімнастыка — гэта любоў. У выпадку з беларускай гімнастыкай можна сказаць, што гэта яшчэ і Любоў Чаркашына. У 2012 годзе яна — бронзавы прызёр алімпіяды, цяпер — суддзя, трэнер, старшыня камісіі спартсменаў Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі. Любоў Чаркашына пусціла карэспандэнтаў «Звязды» ў прывабны і загадкавы свет мастацкай гімнастыкі, гэтаксама як і ў свой уласны.**

***— Любоў, мастацкая гімнастыка — від спорту, дзе значэнне мае кожны год. Як сёлета дзяўчаты-гімнасткі праводзілі час без спаборніцтваў?***

— Для гімнастак, якія планавалі алімпіядай у Токіа скончыць кар'еру, перанос стаў вялікім ударам, а для маладых дзяўчат — добрай магчымасцю ўдасканаліць фізічную і псіхалагічную форму. Мы стараліся максімальна шукаць плюсы. Напрыклад, я, нарэшце, магла шмат часу праводзіць з дачкой, якая так хутка расце, і займацца любімай справай. Галоўны трэнер зборнай Ірына Юр'еўна Ляпарская знайшла геніяльны выхад, каб дзяўчаты не страцілі форму і заадно любоў да гімнастыкі падчас вымушанага каранціну. Спачатку яны самі прыдумвалі сабе практыкаванні, а потым глядзелі выступленні мінулых гадоў і паўтаралі іх на імправізаваных спаборніцтвах. Такі праект даказаў, што любым пакаленнем спартсменак варта захапляцца, таму што чэмпіёнкамі проста так не становяцца, за гэтым заўсёды стаяць унікальныя элементы і вялікая праца.

***— Мастацкая гімнастыка, якую вы паказвалі ў 2012 годзе, і сённяшняя значна адрозніваюцца?***

— Мастацкая гімнастыка развіваецца цыклічна і да яе заўсёды былі розныя патрабаванні. Калісьці патрабавалася больш прыгажосці, і быў час, калі пераважала фізічная падрыхтоўка. Зараз найбольш увагі надаюць складанасці прадмета. У мой час гімнастка выходзіла, і ніхто не ведаў яе набор элементаў. А зараз прыблізна можна прадугадаць, што менавіта яна пераносіць з выступлення ў выступленне. Раней гімнасткі былі больш пластычныя і грацыёзныя, была неверагодная гармонія цела і прадмет. Складанасць прадмета — гэта супер, за паўтары хвіліны выступлення адзіночніцы людзі няспынна захапляюцца, але яны стамляюцца ад гэтага, ім патрэбна адпачыць душой.

***— Чым, на ваш погляд, абгрунтаваны такія змены?***

— Мастацкая гімнастыка — гэта цэлы свет, дзе ўсё ўзаемазвязана: спартсменкі, федэрацыі, гледачы. З кожным цыклам з'яўляецца штосьці новае. Неверагодную тэхніку паказвалі расіянкі Маргарыта Мамун і Яна Кудраўцава, што дало вялікі штуршок развіццю гэтага спорту. У 2000-х «выстраліла» Аліна Кабаева, яна паказала бязмежныя магчымасці цела, і ўсе пачалі за ёй паўтараць, працягваць... Так мастацкая гімнастыка і мяняецца, і развіваецца.

***— Вам як суддзі спаборніцтваў наколькі цяжка ацэньваць выступленні, да якіх пастаянна прад'яўляюцца розныя патрабаванні?***

— Кожны, у тым ліку і суддзя, павінен быць прафесіяналам на сваёй пасадзе, незалежна ад абставін. Гімнастка выконвае вялізную колькасць элементаў, а суддзя — не камп'ютар і нельга поўнасцю выключыць чалавечы фактар. Таму суб'ектывізм судзейства залежыць ад сумлення кожнага чалавека. Калі я сяджу за судзейскім сталом, я проста назіраю за выступленнем і стаўлю адзнаку.

***— Любоў, якія самыя вострыя пытанні сёлета прыйшлося вырашаць камісіі спартсменаў Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі?***

— У камісію ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх гімнастычных дысцыплін. Перш за ўсё нам прыйшлося вырашаць, як змяніць сваю работу, мы зарыентаваліся і цяпер працуем анлайн. Самым папулярным пытаннем ад спартсменаў быў перанос Алімпійскіх гульняў. У гімнастаў яшчэ ёсць час быць адабранымі на алімпіяду на кваліфікацыйных спаборніцтвах. Але адна краіна поўнасцю закрыла ўсе спартыўныя залы, а ў іншай яны былі адкрытыя і спартсмены трэніраваліся ў звыклых умовах. І гэта ўжо няправільна, парушаецца спартыўны прынцып, людзі знаходзяцца не ў роўных абставінах.

***— Алімпійскія ліцэнзіі беларускай каманды ўжо чакаюць свайго часу?***

— Так, дзяўчаты заваявалі поўны камплект ліцэнзій. Усяго на краіну дзве адзіночныя ліцэнзіі і адна групавая. З-за таго, што пуцёўкі неімянныя, увесь наступны сезон будзем выбіраць, хто паедзе ў Токіа. Наша легендарная тройка — Кацярына Галкіна, Аліна Гарнасько і Настасся Салас — будзе змагацца паміж сабой за месца пад сонцам у Токіа. «Групавічак» таксама чакае барацьба. Іх шэсць чалавек, а на алімпійскіх спаборніцтвах выступае група з пяці дзяўчат. Але трэніравацца ўпяцёх — амаль што самазабойства, абавязкова павінен быць чалавек на замену.

***— Як здароўе Кацярыны Галкінай, прымы нашай мастацкай гімнастыкі?***

— Гімнастка як жанчына, як чалавек хутка расце, яе арганізм мяняецца. Вельмі цяжка пастаянна трымаць сябе ў жорсткіх рамках. На жаль, у Каці праблемы з нагамі. Адну нагу амаль вылечылі, зараз займаемся другой. Спадзяёмся, што Каці хопіць часу на рэабілітацыю і вяртанне ў алімпійскую гонку. Яе кар'ера заслугоўвае прыгожай канцоўкі. Канешне, цяжка праходзіць праз аперацыі і амаль што наноў нараджацца. Але, я думаю, гэта зробіць яе мацнейшай і яшчэ больш загартуе характар.

***— Пачынаючы з 2000 года, алімпійскімі чэмпіёнкамі па мастацкай гімнастыцы нязменна становяцца расійскія спартсменкі. Што беларуская школа можа пераняць у расійскай?***

— Ні для кога не сакрэт, што расійская каманда традыцыйна вельмі моцная. Вялізная краіна, шмат талентаў і кожная чэмпіёнка — унікальная асоба, якая задае пэўныя тэндэнцыі ў гімнастыцы. Вельмі добра, што ў нас ёсць такія саапернікі, якія дапамагаюць няспынна павышаць свой узровень. Так, у нас меншыя маштабы краіны, але гэта не перашкаджае беларускай школе трымаць марку. Усе ведаюць, што алімпійская чэмпіёнка Марына Лобач вырасла ў Беларусі. І зараз наша імкненне ісці наперад не згасае. Дрэнны той спартсмен, які не імкнецца да першага месца.

***— Мастацкая гімнастыка — своеасаблівае шоу, дзе вялікае значэнне мае знешні выгляд. Ці можна сказаць, што існуе гімнастычная модная індустрыя?***

— Гаварыць пра індустрыю будзе вельмі гучна. Але пэўныя кірункі і тэндэнцыі ў купальнікаў ёсць. Часта іх шыюць, гледзячы на сукенку ў модным часопісе. І на гімнастцы фасон можа выглядаць больш эфектна, чым на подыуме. Мне падабаецца, калі да купальнікаў дадаюць спаднічкі, гэта выглядае вельмі па-жаночаму і, калі трэба, хавае нюансы фігуры. Нехта на купальніках стварае карціны. Напрыклад, у Аліны Гарнасько на купальніку намалявана пыса пантэры. Найлепшыя купальнікі заўсёды ў вядучых гімнастак ці ў тых, хто можа сабе гэта дазволіць, бо справа нятанная. Але часам дзяўчынка, асабліва маленькая, у купальніку губляецца. Гімнастка да дзесяці гадоў павінна вучыцца і паказваць сваю фактуру, а не фінансавыя магчымасці бацькоў.

***— Як праходзіць выбар музыкі для гімнастычных праграм?***

— Перадусім кампазіцыя павінна пасаваць да ўзросту гімнасткі. Калі дзяўчынка прапаноўвае кампазіцыю са словамі на замежнай мове, Ірына Юр'еўна патрабуе перакладу і разумення яе сэнсу. Падчас каранціну дзяўчаты самі выбіралі музыку пад свае практыкаванні. Больш за тое, пад яе яны пісалі лібрэта, гісторыю, якую потым паказвалі ў выступленні. Адна справа, калі ты тлумачыш, дзе і як трэба ўсміхнуцца і які позірк паказаць, і іншая справа, калі гімнастка сама гэта адчувае.

***— Ці суадносіцца выбар кампазіцыі са спецыфікай прадмета, з якім прыйдзецца выступаць?***

— Большасць выбірае павольныя кампазіцыі пад мячы, хуткія — пад скакалкі. Амаль няма «павольных» булаў. Каці Галкінай аднойчы ставілі «павольныя» булавы, і ўсе скептычна да гэтага ставіліся, але атрымалася добра. Стужка — гэта нешта ўзнёслае, як вальс. Абруч дастаткова ўніверсальны прадмет. Некаторыя ўхітраюцца ставіць праграмы пад рытмічныя, дыскатэчныя кампазіцыі, і суддзі часам не разумеюць, як ацаніць такі нумар. Гімнастцы трэба ўмець слухаць і разумець музыку, яна, як літаратура, у кожным узросце ўспрымаецца па-рознаму.

***— Для таго каб удала раскрыць вобраз падчас выступлення, патрэбныя ўрокі акцёрскага майстэрства...***

— Некалі Ірына Юр'еўна рэалізавала амаль цэлы праект па акцёрскім майстэрстве. Да дзяўчат прыходзілі выкладчыкі сцэнічнага маўлення. Спартсменак вучылі, як трымацца перад камерай, на людзях, даваць інтэрв'ю. Былі ўрокі па макіяжы. Але канкрэтна акцёрскім майстэрствам дзяўчаты займаліся няшмат, у выступленне кожная ўкладвае нешта сваё. Спартсменкі пастаянна працуюць над пластыкай. У іх ёсць харэограф, з якім яны вучаць розныя віды танцаў — ад лірычных да хіп-хопа. Яны могуць адпрацоўваць адны і тыя ж рухі, але выказваць імі розныя эмоцыі і станы. Гэта таксама своеасаблівае акцёрскае майстэрства.

***— Гімнастка можа выдатна выступаць з усімі чатырма прадметамі, ці ўсё роўна нечаму аддаецца перавага?***

— Выступленне на Алімпійскіх гульнях судзіцца па асабістым шматбор'і, таму патрэбна выканаць максімум ва ўсіх практыкаваннях. Але калі паглядзець міжнародныя спаборніцтвы, у нашых адзіночніц больш за ўсё медалёў з мячом. У мяне падчас спартыўнай кар'еры лепш за ўсё атрымліваліся практыкаванні з мячом і булавамі. Самая складаная заўсёды стужка — то яна мокрая, то завязваецца, то ляціць не туды... Сучасная гімнастыка моцна амаладзілася. І спартсменкі ў 16–19 гадоў вельмі смелыя, па-добраму самаўпэўненыя. Яны не баяцца рабіць тое, што раней здавалася немагчымым.

***— У адным з інтэрв'ю вас параўналі з Кацярынай Галкінай, і тады вы сказалі, што яна — таленавітая, а вы «зробленая» гімнастка. Што гэта азначае?***

— У Каці ад прыроды ёсць адчуванне музыкі, цела, прыгажосці, кацiная гнуткасць. Я з яе жартую, кажу: «Што б ні здарылася, ты заўжды падаеш на чатыры нагі». Мне ж прыходзілася шмат чаго завучваць. Я цягавіты Казярог, таму мой талент — у працавітасці, упартасці і цярплівасці трэнераў. Калі спытаць, што дапамагло Любе Чаркашынай, усе скажуць, што яна працавітая, але не таленавітая ад прыроды.

***— Калі назіраеш за вашымі сацыяльнымі сеткамі, складваецца адчуванне, што дачка Вера пойдзе па маміных слядах...***

— Яна любіць праводзіць час у зале, паўтарае за дзяўчатамі, дома танцуе. Вера выдатна чуе музыку, у яе добрая каардынацыя — у мяне гэтага не было, гэта мужавы гены. У нас з Віцем няма мэты аддаць яе ў гімнастыку. Для мяне галоўнае — бачыць сваё дзіця шчаслівым.

***— Любоў, у мастацкай гімнастыцы вы ведаеце ўсе ролі. Якая для вас самая камфортная і якая — самая цяжкая?***

— Лепш за ўсё быць спартсменам, цэнтрам сусвету, для якога ўсе працуюць. Адзінае, што прайграваць непрыемна. А далей ужо складаней, таму што гаворка ідзе не толькі пра тваё жыццё, трэба несці адказнасць за чужыя лёсы. Працуючы трэнерам, я зразумела, наколькі гэта цяжка. Я захапляюся мудрасцю, вытрымкай і цярпеннем трэнераў, якія прысвяцілі гэтай справе ўсё сваё жыццё.

## Алімпійскім гульням у Токіа — быць!

**Міжнародны алімпійскі камітэт задаволены тым, як ідзе падрыхтоўка да летніх Алімпійскіх гульняў — 2021 у Токіа і зімовых Алімпійскіх гульняў — 2022 у Пекіне.**

Аб гэтым заявіў кіраўнік арганізацыі Томас Бах пасля пасяджэння выканаўчага камітэта МАК, якое адбылося ў лістападзе. Падрыхтоўка да летняй Алімпіяды імкліва ідзе наперад. Ужо ў сакавіку 2021 года адновяцца тэставыя спаборніцтвы. Па словах арганізатараў, плануецца вызваліць спартсменаў і гледачоў Алімпійскіх гульняў ад двухтыднёвага каранціну. Разам з тым бяспека кожнага чалавека — па-ранейшаму прыярытэтнае пытанне ў падрыхтоўцы і правядзенні галоўных стартаў.

Падчас візіту ў Токіа 15—18 лістапада Томас Бах заявіў, што ўпэўнены ў здольнасці Токіа правесці бяспечныя Алімпійскія гульні. Міжнародны Алімпійскі камітэт не выключае магчымасці дапамогі ў набыцці вакцыны і прышчэпак ад каранавіруса ўдзельнікам Гульняў. Але гэта пытанне яшчэ будзе абмяркоўвацца з нацыянальнымі алімпійскімі камітэтамі. Кіраўнік МАК наведаў алімпійскія аб'екты японскай сталіцы. Паводле Томаса Баха, на галоўным стадыёне ўжо адчуваецца дыханне галоўнай спартыўнай падзеі. Побач з будучым сэрцам Алімпійскіх гульняў размешчаны музей, дзе выстаўлена лампада з алімпійскім агнём. Эстафета алімпійскага агню стартуе 25 сакавіка 2021 года з прэфектуры Фукусіма. Прэзідэнт МАК высока ацаніў алімпійскую вёску, якая размешчана на насыпным востраве ў заліве Токіа. У вёсцы будзе пражываць каля 17 тысяч спартсменаў і прадстаўнікоў дэлегацый каманд.

Падчас візіту ў Японію Томас Бах выказаў упэўненасць, што XXXII летнія Алімпійскія гульні больш пераносіцца не будуць. Ён спадзяецца, што гэта грандыёзнае спартыўнае свята стане сімвалам салідарнасці ў посткаранавірусную эпоху.

# ЧАЛАВЕК, ЯКОГА БАЯЦЦА ЦЯЖКАСЦІ

**Кожны ў школе пісаў сачыненне на тэму «герой нашага часу», дзе расказваў пра герояў на яго ўласную думку. Але ці задумваўся хтосьці, як насамрэч жывуць такія людзі? Пра гэта «Звяздзе» расказаў паралімпіец Аляксандр ТРЫПУЦЬ. Канешне, героем часу сам сябе ён наўрад ці лічыць. Аднак гэты спартсмен — прыклад гераічнасці і таго, што чалавек можа ўсё. І гэта не проста прыгожая метафара ці матывуючы выраз.**



Спорт у жыцці Аляксандра быў заўсёды, не перашкодзіла нават прыроджаная блізарукасць, праз якую ён вучыўся ў спецыялізаванай школе. Спачатку ў прыярытэце быў бег на 400 метраў, а потым у жыццё гродзенскага хлопца імкліва «ўляцела» кап'ё. Так і знайшоўся галоўны занятак — кіданне кап'я. У 2000 годзе ў Сіднеі на сваіх першых Паралімпійскіх гульнях ён заваяваў серабро ў кіданні кап'я і чацвёртае месца ў шматбор'і. Праз два гады з-за траўмы на абодвух вачах адслаілася сятчатка і левае вока канчаткова перастала бачыць. Аднак з паралімпіяды 2004 года ў Афінах Аляксандр вярнуўся з золатам у кіданні кап'я і серабром у шматбор'і. Праўда, вяртанне было азмрочана мыліцамі — як і старажытнагрэчаскага героя Ахіла, Аляксандра падвяла ступня, якая зламалася падчас спаборніцтваў.

У 2013 годзе Аляксандр прайшоў праз выпрабаванне, пасля якога іншы чалавек апусціў бы рукі. Іншы, але толькі не ён. Шматлікія аскольчатыя пераломы пазваночніка з пашкоджаннем спіннога мозгу і пералом шыі, выкліканыя падзеннем з чацвёртага паверха, кардынальна змянілі жыццё Аляксандра. Далей пачалася гісторыя, вартая сцэнарыя фільма пра супергерояў. Шэраг бальніц, чароды дактароў, дзевяць аперацый... і праз тры гады, у 2016-м, Аляксандр паехаў на Паралімпійскія гульні ў Рыа-дэ-Жанейра. Адтуль вярнуўся з бронзавым медалём, які пацвярджае, што гэты чалавек можа ўсё.

## «МЫ ЎСЁ ПЕРААДОЛЕЕМ»

Сёння Аляксандр Трыпуць рыхтуецца да Паралімпійскіх гульняў у Токіа, перанесеных на 2021 год. «Я вельмі засмуціўся, калі Паралімпіяду перанеслі. Усе спартсмены былі ў прыгнечаным настроі. Як ні круці, алімпіяда дае асаблівае адчуванне, зусім іншы падыход да работы. Тым больш пасля Рыа ў мяне засталася крыўда, што стаў толькі трэцім, — мог бы змагацца за серабро, а то і за золата. Мне хочацца даказаць самому сабе, што я магу стаць чэмпіёнам на галоўных стартах, усе спартсмены да гэтага імкнуцца. Зараз паступова набіраю форму, працую. Пакуль не было спаборніцтваў, вырашыў прайсці медыцынскае абследаванне. Аказалася, што на правым воку пачалося адслаенне сятчаткі. На шчасце, своечасова заўважылі і выправілі гэта, дзякуй дактарам з клінікі Voka. Аб сабе заявілі колішнія траўмы плячэй, рэбраў. Дактары нават раілі зусім не рухаць левай рукой. Але ж для мяне гэта немагчыма, прыйшлося вытрымаць шмат медыцынскіх працэдур. Здавалася б, спаборніцтваў няма, а траўм больш, чым калі яны ёсць. Спадзяюся, мы ўсё гэта пераадолеем. Я нават працую з псіхолагам, каб не страціць сваю псіхалагічную форму і баявы настрой, такі неабходны напярэдадні Паралімпійскіх гульняў», — расказвае Аляксандр.

Больш за ўсё на псіхалагічную і фізічную форму ўплывае адсутнасць спаборніцтваў. Там Аляксандр цалкам адчувае сябе ў сваёй стыхіі і нават сур'ёзныя траўмы, атрыманыя падчас турніру, не перашкаджаюць. У лютым 2019 года на Сусветных гульнях сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах ён перамог з рэкордам Еўропы. І гэта — з страсеннем мозга: «На чэмпіянат свету я прыехаў у гіпсе — зламаў нагу. Выступаць з гіпсам нязручна, калі садзішся на стул, змяняюцца адчуванні, рухі. Але неяк прывык да гэтага. А на трэніроўцы ўпусціў штангу і атрымаў страсенне мозга. Потым не



разумеў, чаму ў мяне ваніты, кружыцца галава. Побач не было доктара, з якім мог бы параіцца. Праз некалькі дзён сустрэўся з сяброўкай з Аўстрыі, яна прывяла да мяне ўрача, якая і паставіла дыягназ. Але нават з няслабым страсеннем мозга выступіў даволі нядрэнна. Тады наша пяцёрка размясцілася вельмі блізка адзін ад аднаго. Кожны мог стаць як першым, так і пятым. Не было жараб'ёўкі. Я, як першы ў рэйтынгу, павінен быў выступіць апошні, але мяне паставілі першым. І патрэбна было адразу выканаць усе шэсць спроб. Ад гэтага зацісднуўся, хваляваўся, а то мог бы кінуць і далей».

Пераможнік Паралімпійскіх гульняў 2016 года ў кіданні кап'я грэк Маноліс Стэфанудакіс кінуў снарад на 29 метраў. За чатыры гады Аляксандр Трыпуць пераўзышоў гэты паказчык: «На спаборніцтвах я ўжо кідаў і за 29, і за 30 метраў. Таму ў Токіа будзе цікавей, чым было ў Рыа. Раней паралімпійскі спорт называлі фестывальным, але зараз мы ўжо пацвердзілі свой высокі спартыўны ўзровень. Неяк прапанаваў здаровым спартсменам кінуць кап'ё з майго крэсла. Яны не ставілі ногі, каб не абапірацца на іх, і стараліся не дапамагаць сабе корпусам. Ніхто нават не прыблізіўся да майго паказчыка. У мяне зусім іншая тэхніка і спецыфіка кідання. Адразу пасля траўмы я спрабаваў кідаць кап'ё як раней, але прыйшлося перавучвацца».

Аляксандр Трыпуць упэўнены, што заканчваць спартыўную кар'еру патрэбна на піку. «З цягам часу будуць з'яўляцца новыя спартсмены. І калі я не буду паказваць вынікі, пра мяне хутка забудуць, такое часта здараецца. А тых, хто сышоў на піку, памятаюць доўга. Ды і пажыць хочацца, адпачыць. Я ўсё роўна не змагу без спорту, нават падчас адпачынку цягне пазаймацца. Таму пытанне аб заканчэнні кар'еры пакуль застаецца адкрытае. Паглядзім, як усё атрымаецца ў Токіа», — разважае Аляксандр.

## «ВЯЛІКІ ДЗЯКУЙ УСІМ»

Не страціць бадзёрасць і сілу духу Аляксандру дапамагаюць сябры. Ён нават жартуе, што пра іх можна напісаць цэлую кнігу. Але непасрэдна перад выступленнем любіць пабыць адзін, настроіцца. Трэба і ўважліва сачыць за тым, каб нічога не забыць, — у паралімпійскім спорце дробязяў не бывае. Дарэчы, з неабходным інвентаром дапамагаюць таксама сябры.

Так, сяброўства з гандбалістамі зрабіла Аляксандра першапраходцам. Для таго каб кінуць кап'ё, спартсменам неабходна адной рукой моцна трымацца за спецыяльную жэрдку. Каб рука не слізгала, Аляксандр мажа яе спецыяльнай мастыкай, якую выкарыстоўваюць гандбалісты. «Калі напружваць руку, якой трымаешся за жэрдку, напружваецца і рука, што кідае кап'ё. З мастыкай пальцы прыклейваюцца, а рука не напружваецца, адпаведна, і другая больш расслабленая. Дарэчы, гэта маё ноу-хау, у сваіх сапернікаў я мастыкі пакуль не бачыў», — дзеліцца спартсмен.

Зручнае для выступлення крэсла з'явілася таксама дзякуючы сябрам. З гэтым дапамагло кіраўніцтва Гродна. Па словах Аляксандра, такога крэсла больш ні ў кога няма. Яно лёгкае, зручнае і хутка складваецца ў спецыяльны чамадан, што вельмі важна для пастаянных раз'ездаў. Тым больш што зроблена яно поўнасцю «пад Аляксандра». Родны горад дапамагае спартсмену ў арганізацыі вучэбна-трэніровачных збораў і наогул, як расказвае Аляксандр, заўсёды ідзе насустрач.

«Мне пашанцавала з людзьмі, якія побач. Я заўжды магу на іх разлічваць. Мяне падтрымліваюць Нацыянальны Паралімпійскі камітэт, Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскім і дэфалімпійскім відах спорту. Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр спорту клапоціцца аб маім здароўі. Я падтрымліваю добрыя адносіны з Беларускай федэрацыяй лёгкай атлетыкі. Былы старшыня Вадзім Дзевятоўскі мне часта дапамагаў з экіпіроўкай, і на ўсіх спаборніцтвах было відаць, што я прадстаўляю краіну. Мае коп'і адрозніваюцца ад коп'яў здаровых спартсменаў, яны важаць 600 грамаў і менш жорсткія. І федэрацыя заўжды заказвала патрэбныя мне коп'і. Сённяшні старшыня федэрацыі лёгкай атлетыкі Іван Ціхан не толькі мой сябар, але і зямляк. Спадзяюся, у Токіа ў нас з ім усё атрымаецца. Калі прыязджаю ў Мінск, трэніруюся ў манежы РЦАП па



лёгкай атлетыцы, яны таксама садзейнічаюць, жыву ў гасцініцы «Спорт-тайм», дзе мне крыху дапамагаюць наладзіць быт», — расказвае суразмоўца.

Аляксандр прызнаецца, што яму хацелася б прыцягнуць больш увагі да паралімпійскага спорту ў краіне. У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах і ў Германіі ёсць спартыўныя клубы, дзе маецца ўсё неабходнае для паралімпійцаў і дзе яны могуць працаваць круглы год. Было б выдатна, калі б нешта падобнае з'явілася і ў Беларусі. «Я не магу скардзіцца на тое, што мяне не падтрымліваюць. Вялікі дзякуй усім. Адзінае — хацелася б часцей выязджаць на спаборніцтвы. Добра, што ў мяне ёсць спонсары, кампанія McDonald's аплачвае мае пераезды і пражыванне на спаборніцтвах. Я эканомлю дзяржаўныя грошы і адначасова прадстаўляю краіну, сваімі поспехамі павышаю яе прэстыж. Але ў параўнанні са здаровымі спартсменамі мы вельмі мала выступаем. Таму хацелася б, каб у паралімпіцаў было больш стартаў», — дзеліцца думкамі спартсмен.

Сваім прыкладам Аляксандр Трыпуць даказвае, што ў жыцці заўсёды ёсць месца для подзвігу, нават калі гэты подзвіг — проста жыць і займацца сваёй справай. Але сам ён да гэтага ставіцца спакойна: «Мне вельмі прыемна, калі за мяне хвараюць і перажываюць. Мне пішуць шмат лістоў, дасылаюць паштоўкі, асабліва дзеці, і я ўсё захоўваю. Але, з іншага боку, з'яўляецца вельмі шмат зайздроснікаў. Чамусьці некаторыя думаюць, што раз у мяне ёсць спонсары, я выступаю, то на мяне сыплюцца грошы і розныя прэферэнцыі. Канешне, гэта непрыемна. Я не люблю плакацца, але... Людзі не разумеюць, праз што я праходжу кожны дзень. З нараджэння ў мяне дрэнны зрок, інваліднае крэсла таксама прыносіць мала задавальнення. Вялікі дзякуй дактарам і майму характару, што я не апусціў рукі і працягваю жыць. Але ніяк не магу зразумець, чаму тут зайздросціць. Стараюся не звяртаць на падобнае ўвагу і канцэнтруюся на сябрах, родных, якія заўсёды за мяне. І, канешне, настройваюся на паралімпіяду, зараз усе думкі толькі аб ёй», — прызнаецца Аляксандр.

## «НЕ МАГУ ЖЫЦЬ БЕЗ СПОРТУ»

У вольны час, якога цяпер вельмі мала, спартсмен любіць пагуляць па горадзе, паглядзець нешта новае. Але нават сваім адпачынкам ён выконвае важную сацыяльную ролю — звяртае ўвагу на праблему безбар'ернага асяроддзя. Па яго словах, з кожным годам яно ўдасканальваецца: «Прыклад безбар'ернага асяроддзя — стадыён «Дынама». Праўда, на яго адкрыцці пасля рэстаўрацыі прыйшлося сутыкнуцца з праблемным ліфтам — каб ён ехаў, даводзілася пастаянна націскаць кнопку. У наступны раз ліфт увогуле не працаваў, але цяпер усё нармальна. Лёгкаатлетычны манеж у БДУФК для мяне зручны. У Мінску яшчэ шмат месцаў, дзе трэба ўдасканаліць безбар'ернае асяроддзе, але я бачу прагрэс. У маім родным Гродне ўвесь цэнтр абсталяваны пандусамі і нізкімі бардзюрамі, што мяне вельмі радуе». Акрамя прагулак па горадзе і сустрэч з сябрамі, Аляксандр захапляецца літаратурай, аддаючы перавагу аўдыякнігам. Дарэчы, любімым творам спартсмен лічыць «Людзі на балоце» Івана Мележа.

Гісторыя Аляксандра ставіць толькі адно пытанне — адкуль у яго столькі матывацыі і сілы? Адказ, як і ўсё, што звязана з гэтым чалавекам, моцны: «Я 22 гады ў спорце і ўжо не магу без яго жыць. Мяне заўжды цягне на фізічную актыўнасць. Для мяне нават выехаць у горад і пакруціць колы крэсла — ужо фізічная нагрузка. Ніхто са спартсменаў не хоча быць статыстам, усе імкнуцца быць лепшымі. Але пры гэтым нельга забываць супрацоўнічаць з урачамі і клапаціцца аб сваім здароўі. Дзякуй богу, што ў нас больш людзей, здольных падтрымаць і не ўтапіць. І таму мая, бадай, ці не галоўная, матывацыя ў тым, каб дапамагаць людзям ці парадай, ці проста сваім прыкладам».

**Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций» и Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению коммунального торгово-производственного унитарного предприятия «СЛУЦК-ВОСТОК» (продавец) в процедуре ликвидации юридического лица, проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1: автомобиль легковой седан Volkswagen Jetta, 2012 г. в., регистрационный знак 2585 IP-5, цвет – черный, кузов № WVWZZZ16ZCM138199.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **19 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 900,00** бел. руб.).

**Лот № 2: автомобиль легковой седан ГАЗ-31105, 2004 г. в., регистрационный знак 2155 АЕ-5, цвет – светло-серый, кузов № 31105040044281.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **650,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **65,00** бел. руб.).

**Лот № 3: автомобиль грузовой вагон ГАЗ-2705, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 6899-5, цвет – светло-серый, кузов № Х9627050090639509.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **100,00** бел. руб.).

**Лот № 4: автомобиль грузовой фургон изотермический IVECO TURBO DAILY 35-10, 2000 г. в., регистрационный знак АК 0912-5, цвет – белый, кузов (рама) № ZCFC3570102314657;**

Начальная цена с НДС (20 %) – **8 700,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **870,00** бел. руб.).

**Лот № 5: автомобиль грузовой бортовой тентовый IVECO TURBO DAILY 35-10, 1998 г. в., регистрационный знак АК 0986-5, цвет – белый, кузов (рама) № ZCFC3570105169568;**

Начальная цена с НДС (20 %) – **7 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **700,00** бел. руб.).

**Лот № 6: автомобиль грузовой фургон изотермический IVECO TURBO DAILY 35-10, 1999 г. в., регистрационный знак АК 6982-5, цвет – белый, кузов (рама) № ZCFC3570105230013;**

Начальная цена с НДС (20 %) – **9 500,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **950,00** бел. руб.).

**Имущество расположено по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 237.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **22.12.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.12.2020** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН 600392961

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ООО «МВЗ ПромСервис», 220033, Минск, пр-т Партизанский, 8, корп. 12, пом. 55** |

**Предмет аукциона: транспорт, спецтехника, оборудование, бывшие в употреблении. Адрес: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 12**

| № лота | Наименование, модель, инв. № | Инв. № | Начальная цена (без НДС), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Машина листогибочная трехвалковая | 426498 | 6 560,00 | 328,00 |
| | Ресивер РВ 500.11.00 | 55710463 | | |
| 2 | Машина обрабатывающая ИВ-2143П | 426476 | 10 320,00 | 516,00 |
| | Пила дисковая по металлу 315х2,5х32 мм (3 шт.) | 2771864 | | |
| | Ховеркарт | 5588983 | | |
| | Каркас (2 шт.) | 5588733 | | |
| 3 | Станок ленточнопильный ARG220 | 440902 | 4 266,00 | 213,30 |
| | Переходник пластиковый для труб (9 шт.) | 5588955 | | |
| | Ручка из неопрена (8 шт.) | 5588954 | | |
| | Ручка резиновая (8 шт.) | 5588953 | | |
| | Сиденье-спинка | 5588952 | | |
| | Соединитель Т-образный пластиковый (30 шт.) | 5588956 | | |
| | Рольганг подающий М280 3000 мм | 417015 | | |
| 4 | Установка воздушно-плазменной резки БМТ 1530ПР | 888938 | 20 595,12 | 1 029,76 |
| | Защитный экран 5-421-019 (2 шт.) | 5588541 | | |
| | Защитный экран 5-422-020 (5 шт.) | 005588645 | | |
| | Мундштук внутренний к РМЗ (5 шт.) | 5588705 | | |
| | Сопло 5-409-008 65А (12 шт.) | 5588482 | | |
| | Сопло 5-409-009 85А (13 шт.) | 5588540 | | |
| | Сопло ЕХ-5-410-010 (13 шт.) | 5588598 | | |
| | Тубус ЕХ-5-306-010 | 5588734 | | |
| | Электрод 45/65/85а (12 шт.) | 5588481 | | |
| | Электрод ЕХ-5-401-002 (13 шт.) | 5588597 | | |
| | Крючок для теплиц (23 шт.) | 5588244 | | |
| | Электросчетчик | 470631 | | |
| 5 | Установка экструзионная ММВЗ Н-06-86-000-00 | 434124 | 5 920,00 | 296,00 |
| | Установка охлаждения оболочки троса | 434123 | | |
| | Установка подачи троса | 434122 | | |

**Порядок ознакомления:** осуществляется по предварительному согласованию, Жогло Юрий Александрович, +375 (44) 778-67-68, пн–пт с 8.00 до 17.00

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» (далее – Закон).**

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 07.12.2020 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** со дня проведения торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 (три) процента** от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте **www.cpo.by**

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения

Предыдущее извещение опубликовано в ЕГРСоБ 07.10.2020, в газете «Звязда» 08.10.2020

**Дата, время и место проведения аукциона: 09.12.2020** в 14.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Для участия в аукционе необходимо подать организатору торгов заявление с приложением всех необходимых документов, а также перечислить задаток в срок с 9.00 **23.11.2020** до 17.00 **07.12.2020** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Контактные данные: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Дворецкий»

**Предмет торгов – Лот:**

1) Капитальное строение с инв. № 150/С-22068 (наименование: цех плодоовощной консервный, инв. № 154; назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака), площадью 790,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Г, 0,3 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000080, площадью 0,2139 га.

Составные части и принадлежности: ограждение территории, инв. № 57, колодец, инв. № 69, наружный водопровод, инв. № 464.

